WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

5 ЛЮТАГА 2010 г.
ПЯТНІЦА
№ 21
(26629)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

У Зацішку ціха на вуліцы. А ці так павінна быць?

«У панядзелак аўтакрама ўслед за бульдозерам, які расчышчаў дарогу, дайшла толькі да крайніх дамоў у вёсцы Зацішак Валожынскага раёна. Далей бульдозер расчышчаць вуліцу ўжо не стаў. Па хлеб пажылыя людзі, а жыве іх там чалавек 14, мусілі ісці на ўскраіну вёскі пехатою — па калена ў снезе. А ім жа цяжка. Чаму так здарылася? Таму што людзі жывуць у закінутай Богам вёсцы?»

Такое пытанне ўвечары ў сераду па «гарачай лініі» адрасаваў нам Мікалай Генадзьевіч Крулікоўскі. Трэба заўважыць, што сам ён жыве ў Пінску і ў Зацішак, дзе ў яго ёсць родныя, ні ў панядзелак, ні ў сераду сам асабіста не наведваўся, а інфармацыю ад сваякоў атрымаў па тэлефоне. Такое здарылася ўпершыню, удакладнілі мы ў заяўніка? Так, раней нічога падобнага не здаралася, пацвердзіў Мікалай Генадзьевіч. Дык і такіх экстрэмальных умоў надвор'я ўжо даўно не было, натуральна, напачатку, калі ўсю краіну так закідала снегам, маглі быць пэўныя затрымкі з расчысткай дарог, даводзілі ўжо мы, але за мінулыя некалькі дзён, верагодна, тэхніка дабралася ўжо і да самых аддаленых населеных пунктаў. Але чытач працягваў сцвярджаць, што Зацішак — закінутая вёска... У чацвер мы патэлефанавалі ў Валожынскае раённае спажывецкае таварыства. Не яно само, вядома ж, павінна чысціць дарогі, а дарожныя службы, але тут найперш трэба было высветліць: ці сапраўды людзі былі забяспечаныя ўсім неабходным?

Пасля кароткай праверкі **намеснік старшыні праўлення таварыства па гандлі Святлана САЛАДУХА** пацвердзіла, што дарога да вёскі Зацішак у панядзелак сапраўды не была расчышчана. Муж загадчыцы аўтакрамы мусіў дамаўляцца з трактарам у ДУ. За ім і ехала аўтакрама да першых дамоў у вёсцы. Да яе прыйшлі амаль усе насельнікі: і карэнныя, і мінчане, што маюць тут дамкі.

— Сёння (на момант размовы. — **С.Р.**) бліжэй да вечара аўтакрама зноў пойдзе ў Зацішак. Загадчыца пагаворыць з людзьмі, паспрабуе дамовіцца, калі будзе такая патрэба, каб больш маладзейшыя дапамаглі з дастаўкай неабходных прадуктаў на дом пажылым вяскоўцам, — сказала Святлана Уладзіміраўна. — Чаму не была расчышчана вуліца ў самой вёсцы, сказаць не магу, паколькі гэтым пытаннем павінны займацца дарожнікі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ІНАВАЦЫЙНЫЯ ПРАЕКТЫ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі ў Гомельскай вобласці азнаёміўся з ходам рэалізацыі буйнога інвестыцыйнага праекта на ААТ «Гомельшкло» па будаўніцтве другой лініі вытворчасці лістовага флаатшкла прадукцыйнасцю 780 тон у суткі. Новы прамысловы цэх па вытворчасці энергаэфектыўнага шкла з магнетронным пакрыццём будзе пабудаваны на ААТ «Гомельшкло» на працягу года. Сяргей Сідорскі падкрэсліў, што ўрад будзе рабіць усё, каб у тым ліку ў Гомельскай вобласці актыўна развіваліся інвестыцыйныя праекты:

— Фактычна мы ставім новы завод. Аб'ём будзе складаць 20 мільёнаў кв.м шкла ў год. Асобна паставім лінію, якая працуе на тэхнічнае пераўзбраенне, закончым тэхнічнае пераўзбраенне існуючай лініі ў сакавіку наступнага года і павялічым у 2,5 раза аб'ём вытворчасці шкла. Гэта магутны праект, які будзе дзейнічаць не толькі на тэрыторыі нашай краіны, ён будзе мець экспартны патэнцыял больш за 150 мільёнаў долараў. Мы прыступілі да рэалізацыі праекта вытворчасці шкла з нанясеннем розных пакрыццяў. Самае галоўнае — зрабіць флаатшкло не толькі для офісаў, але і для кватэр. Да 2011 года пяройдзем на вытворчасць шкла са святлоадбівальнымі і экалагічна энергаабароненымі пакрыццямі. Гэта дасць магчымасць эканоміць цяпло ў кватэрах і адбіваць знешняе святло за кошт прапускной здольнасці.

Плануецца, што ўжо ў сакавіку на новай лініі пачнуць выпускаць сучасную прадукцыю. Рэалізацыя гэтага праекта таксама забяспечыць значнае зніжэнне спажывання энергарэсурсаў пры вытворчасці шкла. Па папярэдніх разліках, расход паліва печы будзе амаль удвая меншы, чым на існуючых вытворчасцях. З пускам новай лініі айчынныя будаўнічая, машынабудаўнічая і мэблевая галіны будуць у поўным аб'ёме забяспечаныя прадукцыяй са шкла найвышэйшай якасці, вырастуць экспартныя пастаўкі як у краіны СНД, так і ў Еўропу.

Другая тэма, якую прэм'ер-міністр Беларусі вызначыў як галоўную — гэта энергетычная бяспека. Замежныя інвестары зацікаўленыя ў фінансаванні будаўніцтва ў Беларусі біягазавых установак. У прыватнасці, адна з нямецкіх фірмаў гатовая штогод укладваць у стварэнне біягазавых комплексаў у нашай краіне ад 30 да 35 млн еўра, за кошт якіх можна пабудаваць да 10 комплексаў, падобных на той, што пабудаваны на ААТ «Гомельская птушкафабрыка», адзначыў Сяргей Сідорскі:

— Мы лічым, што такія ўстаноўкі няма неабходнасці закупляць за межамі нашай краіны. Прынялі рашэнне, што сёлета арганізуем вытворчасць такіх установак у сябе. У Германіі ў сельскагаспадарчай вытворчасці ў год такіх установак усталёўваецца каля 500 штук. Перспектыва для Беларусі вельмі добрая. Першае — энергетычная бяспека. Другое — імпартазамяшчэнне, і трэцяе — атрыманне таннай энергіі. І самае галоўнае, што ў працэсе перапрацоўкі ўтвараецца кампост, у некалькі разоў лепшы за той, які мы выкарыстоўваем пры ўнясенні фасфатных і калійных угнаенняў па існуючых тэхналогіях. Разам з нямецкімі кампаніямі ў найбліжэйшы час створым у Беларусі такую вытворчасць, яна будзе забяспечваць энергетычную бяспеку і мінімальнае спажыванне электрычнай энергіі — будзе працаваць за кошт другасных крыніц.

У Гомелі журналісты даведаліся і пра тое, што ў найбліжэйшы час у краіне плануецца арганізаваць вытворчасць хуткасных пасажырскіх цягнікоў. Прэм'ер-міністр Беларусі адзначыў, што цікавасць да стварэння такой вытворчасці ўжо сёння ёсць у розных замежных кампаній:

— Дабірацца 4,5-5 гадзін з аднаго абласнога цэнтра ў іншы ў XXI стагоддзі — гэта зашмат. У найбліжэйшыя 2-3 гады ў краіне будзе прынята праграма развіцця хуткасных чыгунак. Прэзідэнт даў даручэнне па развіцці такой вытворчасці ў Асіповічах. Ідэя ў тым, каб зрабіць добрыя шматрадныя аўтадарогі ў Беларусі за кошт крэдытных рэсурсаў, у тым ліку кітайскіх. Гэта вельмі выгадныя праекты, і можна будзе дарогі Гомель — Мінск, Мінск — Гродна, а таксама Палессе замкнуць аўтамагістралямі. Гэта тая праца, якую трэба зрабіць у найбліжэйшы час.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Грамадска-кансультатыўны савет зацікаўлены ў працягненні дыялогу ўлады і грамадзянскай супольнасці

Па ініцыятыве старшыні Грамадска-кансультатыўнага савета (ГКС) пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзіміра Макея ўчора адбыліся кансультацыі з чарговай групай членаў савета. Аб гэтым БЕЛТА паведаміў сакратар ГКС Уладзімір Шпакоўскі.

Падчас кансультацый члены ГКС пацвердзілі зацікаўленасць у працягненні работы савета як найважнейшага інструмента дыялогу ўлады і грамадзянскай супольнасці. Члены савета выказалі таксама пажаданні аб актывізацыі дзейнасці ГКС на міжнароднай арэне, унеслі шэраг прапаноў адносна больш шырокага інфармавання грамадства аб рабоце савета. Чарговыя кансультацыі з членамі ГКС запланаваныя на 9 лютага.

З СЯКЕРАЙ НА ЛЕДЗЯШЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Работнікі ЖЭС-25 Савецкага раёна сталіцы змагаюцца з небяспечным лёдам на дахах.

МАРАЗЫ «АДПУСЦЯЦЬ» ТОЛЬКІ Ў ТРЭЦЯЙ ДЭКАДЗЕ ЛЮТАГА

У гэтыя выхадныя ў Беларусі ўсталюецца спакойнае халоднае надвор'е, часам у асобных раёнах пройдзе невялікі снег, паведаміў рэдакцыі <u>начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.</u>

Уначы 6 і 7 лютага 6—13, па ўсходзе да 17—22; удзень у суботу 4—11, у нядзелю 5—12, па ўсходзе да 15. У панядзелак і аўторак ападкаў не будзе і маразы ўзмоцняцца. Уначы 10—17, пры праясненнях да 23, удзень — 7—15. У сераду невялікі снег. Уначы 8—15, пры праясненнях да 18, удзень 5—12.

Больш моцныя маразы чакаюцца ў другой дэкадзе месяца. У асобныя ночы маразы будуць дасягаць 20—25, удзень — 7—14.

Дзмітрый Рабаў адзначыў, што бурнай вясны сёлета спецыялісты не чакаюць. Мяркуецца, што маразы «адпусцяць» нашу краіну толькі ў трэцяй дэкадзе лютага. Тады ў сонечныя дні тэмпература паветра ўсё часцей будзе пераскокваць праз нуль. Пачнуць з'яўляцца першыя слабенькія веснавыя ручайкі.

Сёлета ў сакавіку сярэднямесячная тэмпература чакаецца вышэй за норму на 0,5 градуса. Аднак і ў сакавіку час ад часу можа ісці снег, а ўначы добра падмарожваць. Сіноптыкі разлічваюць, што вясна будзе зацяжной, інакш вялікая вада на рэках можа нарабіць бяды.

Ужо цяпер відавочна, што гідралагічная сітуацыя ў басейнах рэк будзе спрыяць больш моцнай веснавой паводцы, чым летась. Воднасць рэк істотна павышана. Таўшчыня лёду на рэках складае ад 18 да 46 см, а на вадасховішчах — 42—47 см, што ў сярэднім на 5—12 см вышэй за норму. Менавіта тоўсты лёд можа выклікаць, пры хуткім пацяпленні, моцныя заторы і сур'ёзную паводку. Сёння на большай частцы тэрыторыі краіны снегазапасы адпавядаюць норме, аднак на рэках заходніх і паўднёва-заходніх рэгіёнаў краіны велічыня іх на 50—70 працэнтаў больш за звычайную норму для гэтага часу. Ужо цяпер спецыялісты прагназуюць, што ў басейне рэк Прыпяці, Шчары і Дняпра ўвесну будуць вялікія падтапленні не толькі поймы рэк, але і істотных плошчаў сельскагаспадарчых угоддзяў, а ў населеных пунктах — і жылых дамоў. Калі ж вясна будзе бурнай, то «паплыць» могуць цэлыя вёскі побач з рэкамі. Каб своечасова адрэагаваць на магчымую моцную паводку, ужо ў лютым спецыялісты гідралагічнай службы штотыднёва перадаюць усю інфармацыю аб становішчы на рэках экспертам МНС.

Сяргей КУРКАЧ.

З калегіі Мінфіна

ЭКАНОМІКА Ў СТУДЗЕНІ: ПРАЦУЕМ У РЭЖЫМЕ ЖОРСТКАЙ ЭКАНОМІІ

Ацэньваючы работу Міністэрства фінансаў Беларусі летась, кіраўнік міністэрства Андрэй Харкавец канстатаваў, што «ў фінансавай сістэме краіны зроблена нямала». «Важна было ў гэты перыяд (калі адбывалася зніжэнне плацежаздольнага попыту і ўводзіліся абмежавальныя меры з боку асноўных нашых знешнегандлёвых партнёраў) адаптаваць фінансавую сістэму да ўмоў, якія змяніліся, паколькі бюджэты ўсіх узроўняў сутыкнуліся з рэзкім зніжэннем сваіх даходаў», — заявіў ён, выступаючы на калегіі міністэрства. Па сутнасці, міністэрству давялося ў кароткія тэрміны фарміраваць новы бюджэт, каб забяспечыць яго збалансаванасць, зрабіць бюджэт побач з грашова-крэдытнай палітыкай асноўным інструментам макраэканамічнай стабілізацыі.

Паводле слоў міністра, вынікам праведзенай у краіне комплекснай працы стала захаванне станоўчых тэмпаў росту эканомікі, забеспячэнне стабільнасці плацежнай сістэмы. Даходы кансалідаванага бюджэту за мінулы год склалі 62,8 трыльёна рублёў, расходы — 63,8 трыльёна рублёў. Дэфіцыт кансалідаванага бюджэту склаў каля аднаго трыльёна рублёў, а рэспубліканскі бюджэт выкананы з прафіцытам у 0,5 трыльёна.

Гэты год абяцае таксама быць няпростым. Напружанасць у эканоміцы і фінансах, на думку Андрэя Харкаўца, у посткрызісны перыяд будзе захоўвацца, пра што сведчаць і вынікі студзеня. У студзені ў параўнанні з планавай дынамікай даходаў бюджэт ужо не дабірае каля 200 мільярдаў рублёў.

СТАР. 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЦІМАШЭНКА ПАГРАЖАЕ НОВЫМ «МАЙДАНАМ»

Паплечніца Віктара Януковіча, дэпутат ад Партыі рэгіёнаў Ганна Герман заявіла, што яго суперніца Юлія Цімашэнка разглядае магчымасць зняцця сваёй кандыдатуры з выбараў прэзідэнта. Паводле меркавання Герман, Цімашэнка «хутчэй здыме сваю кандыдатуру, каб толькі не прызнаць, што яна прайграла».

У той жа час сама Юлія Цімашэнка заявіла, што гатовая вывесці сваіх людзей на вуліцы і арганізаваць новы «Майдан», калі другі тур прэзідэнцкіх выбараў пройдзе, на яе погляд, несумленна. «Мы будзем паднімаць людзей», — сказала дзейны прэм'ер-міністр і кандыдат у прэзідэнты Украіны на прэс-канферэнцыі ў Кіеве. Пры гэтым Цімашэнка не ўдакладніла, які павінен быць разрыў паміж кандыдатамі ў другім туры выбараў, каб абодва з іх прызналі вынікі.

Цімашэнка паабяцала заклікаць сваіх прыхільнікаў да масавых выступленняў і ў тым выпадку, калі ўвойдуць у сілу папраўкі да закона аб выбарах прэзідэнта, якія былі прынятыя ў сераду Вярхоўнай радай. Ужо пасля гучных заяў Цімашэнкі стала вядома, што прэзідэнт Украіны Віктар Юшчанка ўсё ж такі падпісаў змяненні ў закон аб выбарах. Папраўкі датычацца дзейнасці ўчастковых і акруговых выбарчых камісій. Цяпер не патрабуецца абавязковага кворуму ў 2/3 галасоў для таго, каб выбарчая камісія была правамочнай. Такім чынам, выбаркамы могуць прымаць рашэнні без прадстаўнікоў некаторых палітычных сілаў. Акрамя таго, у выпадку бяздзейнасці ніжэйстаячай выбарчай камісіі рашэнне па яе кампетэнцыі можа прыняць вышэйстаячая.

РУМЫНІЯ ПАГАДЗІЛАСЯ РАЗМЯСЦІЦЬ ЭЛЕМЕНТЫ НОВАЙ ПРА ЗША

Румынія пагадзілася размясціць на сваёй тэрыторыі элементы новай сістэмы супрацьракетнай абароны ЗША. Пра гэта паведамляе AFP са спасылкай на заяву, якую зрабіў прэзідэнт Румыніі Траян Бэсеску. Паводле яго слоў, новая сістэма пачне працаваць ужо ў 2015 годзе.

Бэсеску адзначыў, што Румынія атрымала афіцыйную прапанову аб супрацоўніцтве ў рамках праграмы па размяшчэнні элементаў сістэмы ПРА ад прэзідэнта ЗША Барака Абамы. Паводле яго слоў, на тэрыторыі краіны будуць размешчаныя ракеты-перахопнікі сярэдняй дальнасці.

У ЛАТВІІ ЗМЯКЧЫЛІ ПАКАРАННЕ ЗА НЕВЫВЕШВАННЕ СЦЯГА

4 лютага латвійскі парламент прыняў папраўкі ў Адміністрацыйны кодэкс, якія змякчаюць адказнасць за невывешванне сцяга. Пра гэта паведамляе DELFI.

Жыхары Латвіі паводле заканадаўства абавязаныя вывешваць дзяржаўныя сцягі (як на дзяржаўных, так і на прыватных дамах) з нагоды дзяржаўных святаў, напрыклад, у Дзень Незалежнасці, які адзначаецца 18 лістапада.

Парушальнікам гэтага правіла дагэтуль пагражаў штраф: 30 латаў (каля 60 долараў) для грамадзян і 50 латаў (каля 100 долараў) для арганізацый. Цяпер, паводле папраўкі, якія прыняў Сойм, у выпадку першага парушэння вінаваты атрымае толькі папярэджанне. Пры паўторным парушэнні яго аштрафуюць на суму да 30 латаў.



Аляксандр Лукашэнка накіраваўся з рабочым візітам у Швейцарыю

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка накіраваўся з рабочым візітам у Швейцарыю. Кіраўнік дзяржавы сустрэнецца з прадстаўнікамі бізнэсу і палітычных колаў гэтай краіны. Дзелавая частка візіту, які працягнецца некалькі дзён, сумешчана з кароткатэрміновым адпачынкам.

Прэзідэнт павіншаваў Расціслава Янкоўскага з юбілеем

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў вядучага майстра сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага, народнага артыста СССР Расціслава Янкоўскага з 80-годдзем з дня нараджэння.

Кіраўнік беларускай дзяржавы падкрэсліў, што творчасць Расціслава Янкоўскага з'яўляецца прыкладам рэдкага акцёрскага таленту, найвышэйшага прафесіяналізму, няспынных духоўных пошукаў і вернасці свайму прызванню. «Мы цэнім Вас і як галаву выдатнай дынастыі Янкоўскіх, якая зрабіла вялікі ўнёсак у развіццё савецкай, беларускай і рускай культураў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка ў віншаванні.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ЗНОЎ ТРАГІЧНАЕ ЗДАРЭННЕ НА ПАЛЯВАННІ

Каля 21 гадзіны, калі паляванне ў паляўнічых угоддзях сялянска-фермерскай гаспадаркі ўжо было скончана, у аднаго з паляўнічых пры выхадзе з легкавога аўтамабіля адбыўся самаадвольны стрэл з паляўнічага карабіна.

Куля, прабіўшы кузаў машыны і сцяну металічнага вагончыка, трапіла ў грудзі грамадзяніна, які ў гэты момант знаходзіўся ў вагончыку. Пацярпелы быў дастаўлены ў бальніцу, дзе яму зрабілі аперацыю.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ВЫВОЗІЎ ПАД СНЕГАМ МЕДЗЬ

На аўтадарозе Баранавічы—Гродна каля в. Гінцавічы супрацоўнікі міліцыі звярнулі ўвагу на аўтамашыну, якая везла снег.

Вадзіцель растлумачыў, што ён вывозіць снег за горад — аказвае паслугі насельніцтву. І гэта насцярожыла міліцыянераў, бо кожны стараецца ад снегу хутчэй пазбавіцца — выкарыстаў момант, і на абочыну ці пустку, а гэты некуды вязе ды і хваліецца дужа. Калупнулі той снег, а пад ім каляровы метал. Паўтары тоны медзі, латуні, свінцу... давялося канфіскаваць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ХАБАР ЗА СПРЫЯЛЬНАЕ ВЫРАШЭННЕ

Службовая асоба ААТ «Гроднажылбуд» была затрымана групай «Альфа» пры атрыманні хабару ў памеры каля 8 тысяч долараў, вядзецца следства.

Паводле інфармацыі прэс-службы УКДБ па Гродзенскай вобласці, хабар вымагаўся ў прадстаўнікоў камерцыйных структур за спрыяльнае вырашэнне пытанняў аб закупках будаўнічых матэрыялаў і абсталявання. Памер незаконнага грашовага ўзнагароджання, так званага «адкату», складаў 6 працэнтаў ад сумы фінансавай здзелкі. Сабраныя доказы аб атрыманні гэтай службовай асобай і яшчэ аднаго хабару ў суме 5 тысяч 500 еўра.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

МАГІЛЁЎШЧЫНУ ЗАКІДАЛА СНЕГАМ

Снегапад пачаўся 3 лютага ўвечары і працягнуўся на наступны дзень. Толькі за ноч, паводле інфармацыі магілёўскіх сіноптыкаў, у вобласці выпала ад 2 да 8 мм ападкаў. Вышыня снежнага покрыва ў абласным цэнтры павялічылася на 4 сантыметры.

Дарожная тэхніка працуе на расчыстцы, але снег засыпае дарогі зноў. Нават у цэнтры Магілёва асфальту амаль не бачна, аўтамабілям даводзіцца ездзіць па снежнай кашы і вельмі павольна. Хоць рух транспарту 4 лютага значна парадзеў, Дзяржаўтаінспекцыя параіла ўстрымацца ад паездак на аўтамабілях і карыстацца грамадскім транспартам.

Ілона ІВАНОВА.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — <u>www.zviazda.by</u>

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 05.02.2010 г. (для б/н разлікаў)		Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ
▲ 1 долар ЗША ... 2 888,00	1 чэшская крона ... 152,87	USD ... 30,0054
▼ 1 еўра ... 4 000,46	1 польскі злоты ... 989,69	UAH ... 37,2045
1 латвійскі лат ... 5 638,42	▲ 1 расійскі рубель ... 96,25	1000 BYR ... 10,4330
1 літоўскі літ ... 1 157,24	1 украінская грыўня ... 358,54	EUR ... 41,6115

Агенцтва УладзіміраГраўцова

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА) ПО ПОРУЧЕНИЮ ЛОГОЙСКОГО РАЙПО (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже **<u>здания хлебозавода, об. пл. 745,9 кв.м,</u>** расположенного по адресу: Минская область, г. Логойск, ул. Тимчука, 11. Начальная цена с НДС – 1 005 360 000 бел. руб. Площадь земельного участка 0,7110 га. Задаток в сумме 100 000 000 бел.руб. перечисляется на **р/с № 3012020200010 в Октябрьское отделение ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится путем полной оплаты всей стоимости единовременным платежом, за вычетом суммы задатка, на расчетный счет продавца в течение 5 календарных дней после подписания договора купли-продажи *(если иное не будет предусмотрено договором купли-продажи).* С утвержденным проектом договора купли-продажи можно ознакомиться у организатора аукциона. Извещение о проведении аукциона было опубликовано в газете «Звязда» от 11.12.2009. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **17.02.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 16.02.2010 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

ОАО «УПРАВЛЕНИЕ МЕХАНИЗАЦИИ № 91»
извещает своих акционеров, что очередное собрание акционеров состоится 05 марта 2010 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11.

Регистрация участников начинается с 8.45 по предъявлении документа, удостоверяющего личность.

<u>Повестка дня:</u>

1. Об итогах работы финансово-хозяйственной дятельности Общества в 2009 году и основных направлениях деятельности Общества на 2010 год.
2. Утверждение годового бухгалтерского отчета, баланса Общества и направлений использования чистой прибыли за 2009 год.
3. Утверждение дивидендов за 2009 год.
4. Утверждение порядка распределения прибыли, оставшейся в распоряжении предприятия за 2009 год. О направлениях использования чистой прибыли Общества в 2010 году.
5. О работе Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии в 2009 году.
6. Утверждение условий материального вознаграждения членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
7. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
8. Об утверждении Регламента работы ОАО «Управление механизации № 91» с реестром владельцев ценных бумаг.

Статьи баланса Общества за 2009 год.
Актив — 20169 млн руб.
Пассив — 20169 млн руб.
Чистая прибыль — 225 млн руб.

Тел. (8 017) 226 77 63.

Наблюдательный совет ОАО «Управление механизации № 91»

УНП 100055130

Ведай сваіх

ДЗЮДАІСТ НА ПОДЫУМЕ

На конкурс «Містар свету» ад нашай краіны вылучаны прафесійны спартсмен, любімая мадэль Івана Айплатава з «нетыпова беларускай» знешнасцю

Выбранне самага прыгожага мужчыны свету адбываецца рэгулярна, пачынаючы з 1996 года. Заснавальнікам гэтага конкурсу, дарэчы, з'яўляецца добра вядомая ў свеце прыгажосці Джулія Морлі (ёй жа належаць правы і на конкурс «Міс свету»). І хоць «Містара свету» называюць удвая радзей, чым чарговую «Міс», але менш прэстыжным спаборніцтва ад гэтага не становіцца: пераможца ў дадатак да тытула самага жаданага прыгажуна ў свеце атрымлівае прыз у 50 тысяч долараў, а таксама пуцёўку ў вялікі мадэльны бізнэс — кантракт з вядучымі агенцтвамі... Нават дзіўна, што Беларусь і беларусы так доўга не звярталі ўвагі на гэты конкурс. Зрэшты, сёлета ўсё змянілася. Наша краіна ў ліку 80 іншых удзельнікаў дэлегуе на злёт прыгажуноў, спартсменаў і разумнікаў, што адбудзецца ў сакавіку ў Сеуле (Паўднёвая Карэя), свайго прадстаўніка.

Мінчаніну Міхаілу Баранаву 21 год, ён вучыцца ва Універсітэце фізкультуры, прафесійна займаецца дзюдо і вось ужо 3 гады як працуе ў Нацыянальнай школе прыгажосці. Зрэшты, на пытанне, што для яго важнейшае, хлопец без ваганняў адказвае: безумоўна, спорт, а мадэльная кар'ера — гэта, хутчэй, хобі. І ў дадзеным выпадку гэта выдатна, бо конкурс «Містар свету» істотна адрозніваецца ад іншых конкурсаў прыгажосці — у прэтэндэнтаў павінна быць вельмі сур'ёзная спартыўная падрыхтоўка, бо сярод выпрабаванняў іх чакаюць фізічныя спаборніцтвы, у тым ліку па экстрэмальных відах спорту (напрыклад, па рафтынгу). Але прынамсі нашаму «містару» няма чаго баяцца, у яго за плячыма не толькі больш як 10 гадоў заняткаў спортам, але і пастаяннае ўдасканаленне навыкаў пад строгім бацькавым кіраўніцтвам. А бацька, таксама Міхаіл Баранаў — між іншым, заслужаны майстар спорту, двухразовы чэмпіён свету па самба, заслужаны трэнер СССР і Беларусі!

Рэзоннае пытанне — як жа спартсмен і сын спартсмена ўвогуле трапіў у мадэльны свет? «Выпадкова, — аджартоўваецца Міхаіл-малодшы, — ішоў аднойчы па вуліцы каля Нацыянальнай школы прыгажосці, убачыў аб'яву пра чарговы набор, зайшоў і сказаў: «Вазьміце мяне ў мадэлі». Зрабілі пару здымкаў... і ўзялі!».

СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X

ВІКТАР ЯНУКОВІЧ УЖО 40 ГАДОЎ ВЫРАБЛЯЕ... АСФАЛЬТ, А Ў ЮЛІІ ЦІМАШЭНКІ КОЖНЫ РАНАК ПАЧЫНАЕЦЦА... У РАДЗІЛЬНІ

Беларускія цёзкі будучага прэзідэнта Украіны падзяліліся са «Звяздой» сваімі прагнозамі

ЦІМАШЭНКА: у радзільню як на працу

— Шкарпэткі не вяжу, крыжыкам не вышываю, касу не насіла, — смяецца беларуска Юля Цімашэнка і дадае: — Аддаю перавагу кароткім валасам. І ўвогуле, у палітыку не ўнікаю. Працую анестэзіёлагам у раддоме. Украінская цёзка мае сваё жыццё, свае інтарэсы.

Апошнюю кнігу, якую прачытала беларуска, стала кніга па анестэзіялогіі. Любімы колер дзяўчыны — зялёны, па знаку задыяка — Рыба. Не курыць.

Украінская Юля Цімашэнка ў свае 50 гадоў мае замужнюю дачку. Прычым зяць не абы-хто, а рок-музыкант Шон Кар. Беларускай Юлі самой толькі 26. Але разам з мужам яна таксама гадуе дачушку. Хто ведае, з кім пасябруе маленькая Цімашэнка, але не выключана, што ў дзіцячы садок у Рагачове могуць прыехаць і англійскія карапузы...

Знакамітае прозвішча перайшло нашай Юлі ад мужа (як, дарэчы, і кандыдатцы ва ўкраінскія прэзідэнты). Яго ўкраінскае паходжанне наша дзяўчына адмаўляе: муж — карэнны беларус. Самае цікавае, што ў раддоме, дзе працуе, з такім знакамітым прозвішчам яна не адна, ёсць яшчэ і ўрач Цімашэнка. А вось каб супадала і імя — гэта рэдкасць.

— Мы з сям'ёй як у Адэсу ездзілі, то там усе здзіўляліся — жарт, сама Юля Цімашэнка, — працягвае дзяўчына. — І яшчэ як пашпарт мяняла, таксама ўсе дзівіліся.

> **Як падае электронны даведнік абанентаў Мінска, у горадзе жыве 193 Цімашэнкі і 150 Януковічаў (Юшчанкаў, дарэчы, толькі 38). Ёсць у Мінску і свой Пуцін. Яшчэ горад багаты на 60 Валчковых, 68 Пушкіных і 84 Талстых. А вось Лермантавых і Абамаў у Мінску не значыцца. Івановых жа — ажно 2230 (!) чалавек, Пятровы пазіцыі здаюць — іх 1645, Сідаравых — толькі 502. Яшчэ па сталічнай зямлі ходзіць 500 Багдановічаў і 435 Мядзведзевых.**

Украінская Цімашэнка напярэдадні выбараў завяла свой блог, выпускніца Аршанскага медвучылішча Юля Цімашэнка інтэрнэтам асабліва не захапляецца, у вольны час любіць кулінарыць. Як сама прызнаецца, муж найбольш любіць пельмені і макароны, бо яны хутка гатуюцца. Сама ж дзяўчына любіць стравы з белага мяса.

Паводле прагнозаў беларускі, на выбарах ва Украіне пераможа Віктар Януковіч.

— Я проста сачыла за папярэдняй інфармацыяй. Паводле тых звестак, Януковіч апярэджваў маю цёзку. Але як бы там ні вырашылася, я жадаю ёй поспехаў і няхай і надалей ідзе сваім жыццёвым шляхам.

ЯНУКОВІЧ: «...Люблю «саджаць агародзікі»

Віктар Фёдаравіч Януковіч. Выпадала сустракаць цёзкаў па імені і прозвішчы, але каб поўнага цёзку... Між іншым, Віктар Януковіч працуе... варшчыкам асфальтавай сумесі. Салігарчаніну 60 гадоў, мае двух унукаў. Любіць дранікі са смятанай. Не курыць.

Украінскі кандыдат у прэзідэнты, паводле вядомых усім абставінаў, не прымае аранжавы колер. Януковіч-беларус аддае перавагу зялёнаму.

СТАР. 2

ЗА РАЎНАПРАЎНАЕ ПАРТНЁРСТВА

Венгерскія парламентарыі падтрымліваюць памкненне беларускіх калегаў да ўдзелу ў Еўранэст на аднолькавых пачатках

Парламенцкая дэлегацыя Венгрыі цяпер з візітам у Беларусі — упершыню за апошнія пару дзясяткаў гадоў. Перш-наперш госці выправіліся, натуральна, да сваіх калегаў. У гутарцы з венгерскай дэлегацыяй старшыня Савета Рэспублікі Барыс БАТУРА падкрэсліў, што ўзаемадзеянне парламентарыяў здольнае надаць дынамізм двухбаковым адносінам у палітычнай, эканамічнай, навуковай, культурнай сферах. Спікер зрабіў акцэнт на тым, што беларускі бок зацікаўлены ва ўдзеле ў парламенцкім складніку Усходняга партнёрства — Еўранэст — менавіта «на правах паўнапраўнага членства». Ён таксама адзначыў высокі патэнцыял узаемадзеяння з краінамі Вышаградскай групы і згадаў запланаваную сустрэчу прадстаўнікоў Вышаградскай чацвёркі (Чэхія, Славакія, Венгрыя і Польшча) і краін — удзельніц Усходняга партнёрства. Яна мае адбыцца ў Будапешце 24 лютага. Дарэчы, Венгрыя падтрымлівае Беларусь у яе памкненні да раўнапраўнага ўдзелу ў рабоце парламенцкага вымярэння Усходняга партнёрства. Адказваючы на пытанні беларускіх журналістаў, Габар ХАРШ, член Дзяржаўнага Сходу Венгрыі, кіраўнік венгерскіх нацыянальных дэлегацый ў Міжпарламенцкім Саюзе і Парламенцкай асамблеі АБСЕ, запэўніў: «Для нас самае важнае — гэта раўнапраўнае партнёрства. Нам хацелася б, каб беларускія парламентарыі нароўні ўдзельнічалі ў сустрэчах».

Віцэ-спікер верхняй палаты беларускага парламента Анатоль РУБІНАЎ назваў прыезд калегаў гістарычным у двухбаковых адносінах, «паколькі гэта першы візіт парламенцкай дэлегацыі Венгрыі ў Беларусь за апошнія гадоў 20». «Мы поўнасцю адкрытыя, наш дыялог па ўсіх пытаннях будзе шчыры і праўдзівы», — засведчыў ён. А. Рубінаў таксама падкрэсліў асаблівую ролю пасла Венгрыі ў Беларусі Ферэнца Контры:

— Ён вельмі прадуктыўна, з нашага пункту гледжання, працуе на карысць дзвюх дзяржаў.

Паводле меркавання парламентарыя, у Беларусі і Венгрыі фактычна няма сур'ёзных рознагалоссяў у поглядах на развіццё падзей. «У нашых краін добрыя перспектывы для супрацоўніцтва», — рэзюмаваў палітык. І кіраўнік венгерскай дэлегацыі Габар ХАРШ яго ў гэтым цалкам падтрымлівае.

— Візіт будзе карысным тады, калі ўсе справы будуць абмяркоўвацца адкрыта. І нашы сустрэчы паказалі, што ёсць аб чым гутарыць, — перакананы замежны госць.

Ала МАЧАЛАВА.

СТУДЭНТ= ПРЫЗЫЎНІК?

Дэпутат Анатоль ГЛАЗ прапануе скасаваць адтэрміноўку для ўсіх «пакутнікаў навукі» і не выключае, што ў хуткім часе гэта дазволіць скараціць тэрмін службы да года

Законапраект аб воінскім абавязку і воінскай службе нарабіў шмат шуму ў парламенце. У тым выглядзе, у якім яго падтрымалі народныя абраннікі пры разглядзе ў першым чытанні, ён прадугледжвае адмену адтэрміноўкі для завочнікаў. Аднак спрэчак было шмат, гаворка заходзіла нават пра тое, каб перагледзець медыцынскія падставы для адтэрміноўкі. Маўляў, адтэрміновак у нас больш чым у каго іншага на прасторах СНД, а з прызыўным кантынгентам ёсць праблемы. Усе сыходзяцца хіба толькі на тым, што адтэрміноўку трэба ўзяць ды адмяніць. А вось для каго канкрэтна... тут погляды разыходзяцца. Не спыняюцца дыскусіі і цяпер — пры падрыхтоўцы да другога чытання. Мы пісалі раней пра ініцыятыву дэпутата Уладзіміра Здановіча прызываць у войска студэнтаў-платнікаў. Аднак яна не была падтрыманая рабочай групай, якая займаецца падрыхтоўкай законапраекта і пакуль што ў тэксце дакумента па-ранейшаму значыцца палажэнне аб адмене адтэрміноўкі менавіта для завочнікаў. Аднак шанц, што становішча зменіцца да вясны (калі пачнецца чарговая сесія і праект будзе разгледжаны парламентарыямі ў другім чытанні), застаецца. Выказваюцца ўсё новыя і новыя ідэі. Сваю прапанову ў камісію па нацыянальнай бяспецы ўнёс **Анатоль ГЛАЗ, намеснік старшыні пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ,** які ў свой час не адзін год узначальваў Магілёўскую абласную прызыўную камісію. Народны абраннік мяркуе, што выйсцем стаў бы прызыў у войска студэнтаў... усіх формаў навучання — і платнікаў, і бюджэтнікаў, і завочнікаў, і вочнікаў... Падрабязнасці — з першых вуснаў:

— Я прапаную разгледзець на пасяджэнні рабочай групы магчымасць адмены адтэрміноўкі ад прызыву ў шэрагі Узброеных Сілаў для ўсіх студэнтаў ВНУ, ССНУ, навучэнцаў ПТВ незалежна ад формы навучання пры дасягненні імі ўзросту 20 гадоў ці пасля заканчэння аднаго ці двух курсаў з далейшым працягам навучання пасля заканчэння тэрміну службы.

На думку народнага абранніка, так будзе забяспечаная сацыяльная справядлівасць — роўнасць усіх прызыўнікоў перад законам. І выйграе ад гэтага ў першую чаргу само войска:

— Па-першае, значна вырасце ўзровень агульнай культуры ўнутры воінскіх падраздзяленняў — за кошт уплыву інтэлектуальна больш высока падрыхтаваных прызыўнікоў. Па-другое, у шэрагі Узброеных Сілаў прыйдзе фізічна сталае папаўненне, здольнае ў больш кароткія тэрміны асвойваць найноўшыя складаныя ўзоры ўзбраенняў і тэхнікі, — мяркуе палітык.

Такі падыход, на яго думку, ужо ў самай блізкай перспектыве «дасць рэальную магчымасць скараціць да аднаго года тэрмін абавязковай воінскай службы».

Дэпутат бачыць станоўчыя моманты ў гэтым плане і для народнай гаспадаркі:

— Знікне балючая праблема адпрацоўкі маладым спецыялістам абавязковага тэрміну па размеркаванні. Сёння, адразу па заканчэнні навучальнай установы, малады спецыяліст прызываецца ў шэрагі Узброеных Сілаў і затым не вяртаецца (за рэдкім выключэннем) на месца работы, куды накіроўваўся па размеркаванні. Гэта асабліва актуальна для галінаў народнай гаспадаркі, у якіх хранічна не хапае спецыялістаў, нягледзячы на каласальныя затраты дзяржаўных сродкаў на іх падрыхтоўку (такія, як сельская гаспадарка, медыцына і іншыя).

Паводле яго меркавання, гэта будзе спрыяць і ўладкаванню асабістага жыцця маладых людзей.

Палітык канстатуе, што тут патрэбныя дэталёвыя падлікі: трэба браць пад увагу патрэбу ў прызыўным кантынгенце, «хоць бы на найбліжэйшыя 6-7 гадоў з улікам мерапрыемстваў па рэфармаванні узброеных сілаў і іншых сілавых структур», а таксама зыходзіць з рэальнай колькасці студэнтаў усіх формаў навучання, якія могуць быць прызваныя — з улікам паказчыкаў прыдатнасці па здароўі, сямейным стане і гэтак далей.

— І нават калі гэту меру (аб прызыве ў войска студэнтаў. — **Аўт.**) рэальна трэба ўводзіць праз тры-чатыры гады, запісана яна ў закон павінна быць цяпер — з называннем года, калі пачне дзейнічаць, — перакананы дэпутат.

Ці аформіцца гэта ідэя ў літару закона, пакажа час. А дыскусія тым часам застаецца адкрытай.

Зоя ВАРАНЦОВА.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «ТРИКОТАЖТОРГ»

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ГОДОВОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

Собрание состоится 11 марта 2010 года в административном здании ОАО «Трикотажторг» по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 30.

**Регистрация участников с 14.00 до 14.45.
Начало собрания в 15.00.**

Повестка дня

1. Утверждение годового отчета, годового баланса ОАО «Трикотажторг» за 2009 год. *Докладчики* — генеральный директор Кобза И.Э., главный бухгалтер — Нараб Т.В.
2. Информация по заключению аудиторской проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год. Утверждение отчета Ревизионной комиссии ОАО «Трикотажторг». *Докладчик* — председатель Ревизионной комиссии Величко О.Ф.
3. О выплате дивидендов акционерам ОАО «Трикотажторг» за 2009 год. *Докладчик* — главный бухгалтер Нараб Т.В.
4. Основные направления использования чистой прибыли на 2010 год. Порядок выплаты дивидендов в 2010 году. *Докладчик* — главный бухгалтер Нараб Т.В.
5. Утверждение регламента работы ОАО «Трикотажторг» с реестром владельцев ценных бумаг (акций). *Докладчик* — начальник финансово-экономического отдела Барышева Т.А.
6. Утверждение условий материального вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии ОАО «Трикотажторг» в 2010 году. *Докладчик* — главный бухгалтер Нараб Т.В.
7. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии ОАО «Трикотажторг».

С материалами по вопросам повестки дня собрания акционеров можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник — четверг с 8.30 до 17.15, пятница с 8.30 до 16.00) за 10 дней до начала собрания по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 30. Справки по телефону 292 45 90.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
- акционеру Общества — документ, удостоверяющий личность;
- представителю акционера — доверенность и документ, удостоверяющий личность.

Наблюдательный совет

ЭКАНОМІКА Ў СТУДЗЕНІ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Паступленні па падатку на дабаўленую вартасць, акцызах, даходах ад знешнеэканамічнай дзейнасці праваленыя, — паведаміў міністр. — Калі па знешнеэканамічнай дзейнасці тлумачэнні яшчэ можна знайсці, то правалы па ПДВ і акцызах — вынік недастатковых тэмпаў росту эканомікі». Гэта — трывожны сігнал, лічыць Андрэй Харкавец.

Акрэсліваючы ў цэлым арыенціры бюджэтна-падатковай палітыкі на гэты год, міністр зазначыў, што яна павінна быць накіраваная на стымуляванне высокіх тэмпаў эканамічнага развіцця і забяспечваць павышэнне дабрабыту беларусаў. «Нам трэба захаваць стабільнасць, устойлівасць і збалансаванасць бюджэтаў усіх узроўняў, забяспечыць безумоўнае выкананне сацыяльных абавязацельстваў дзяржавы перад грамадствам, — кажа ён. — І ўсе гэтыя задачы павінны вырашацца ў рэжыме жорсткай эканоміі, пры захаванні якасці бюджэтных паслуг». Адным з галоўных прыярытэтаў дзейнасці Мінфіна, паводле слоў яго кіраўніка, будзе стварэнне камфортных умоў для вядзення бізнэсу за кошт паляпшэння падатковага клімату, удасканалення сістэмы ўліку і справаздачнасці, укаранення ў гэтай сферы міжнародных стандартаў развіцця фінансавых інстытутаў.

У прыватнасці, міністэрства мае намер прадоўжыць працу па збліжэнні нацыянальнага заканадаўства з Міжнароднымі стандартамі фінансавай справаздачнасці (МСФС). Ёсць намер у новым законе аб бухуліку і справаздачнасці замацаваць мэты і прынцыпы складання справаздачнасці ў адпаведнасці з МСФС і вызначыць адпаведныя патрабаванні да структуры і зместу бухсправаздачнасці. Паводле меркавання Андрэя Харкаўца, у цэнаўтварэнні, фарміраванні сабекошту неабходна пашырыць сферу прымянення свабодных цэнаў і тарыфаў, знізіць колькасць дакументаў па цэнах, што афармляюцца, выключыць з сабекошту затраты, якія не звязаныя з асноўнай дзейнасцю прадпрыемства.

Яшчэ адна ініцыятыва, якая прагучала на калегіі, — зніжэнне памеру адлічэнняў у фонд сацыяльнай абароны насельніцтва (ФСАН) і спрашчэнне парадку іх вылічэння і платы. Гэты крок дазволіць павысіць міжнародную ацэнку падатковай сістэмы Беларусі, таму што пакуль асноўнымі фактарамі, якія яе зніжаюць, і з'яўляюцца існуючая сістэма адлічэнняў у ФСАН, а таксама складанасці ў адміністраванні асобных падаткаў. «Для паляпшэння падатковага клімату нам сумесна з Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны неабходна выпрацаваць канкрэтныя прапановы па зніжэнні памеру адлічэнняў у ФСАН, а таксама спрасціць парадак іх вылічэння і платы», — адзначыў міністр.

Закранаючы сітуацыю па фінансавым рынку краіны, Андрэй Харкавец канстатаваў, што пакуль рынак застаецца недастаткова развітым. Мінулы год, на жаль, тут ніякіх змен не прынёс, дзяржаўныя прадпрыемствы ніякай актыўнасці не праяўляюць, каб прыцягваць рэсурсы на сваё развіццё шляхам выпуску карпаратыўных аблігацый. «Ім, — заўважыў міністр, — прасцей звяртацца па дзяржаўную падтрымку». Ключавой задачай Мінфіна сёлета стане дэбютны выхад Беларусі на міжнародны рынак капіталу. Андрэй Харкавец падкрэсліў, што для рэспублікі важна адкрыць для сябе гэты рынак, каб пры неабходнасці аператыўна скарыстацца гэтым інструментам. Да таго ж гэта стане сур'ёзным сігналам для развіцця карпаратыўных займаў на мэты прыцягнення рэсурсаў для інвестыцый у мадэрнізацыю эканомікі.

Яшчэ адна прапанова міністэрства, агучаная на калегіі, датычыцца стварэння ў рэспубліцы дзяржаўнага фінансавага холдынгу, праца якога дазволіць максімальна эфектыўна на рынкавых умовах прасоўваць айчынную прадукцыю на замежныя рынкі. У гэты холдынг прапануецца ўключыць дзяржаўную лізінгавую кампанію «Прамагралізінг», страхавую кампанію «Белэксімгарант» і экспартна-імпартны банк. Андрэй Харкавец патлумачыў, што магчымасцяў адной лізінгавай кампаніі для гэтых мэтаў недастаткова.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

ДЗЮДАІСТ НА ПОДЫУМЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Хлопца можна ўбачыць на рэкламных шчытах школы прыгажосці (а мы ўсё гадалі — адкуль такі знаёмы твар? — **Аўт.**), а летась адбыўся і яго вялікі дэбют на Маскоўскім тыдні моды, на паказе Івана Айплатава.

— Насамрэч, адкрыю вам сакрэт, новых хлопцаў мы шукаем найперш менавіта ва Універсітэце фізкультуры, — дадае дырэктар Нацыянальнай школы прыгажосці Вольга Сяржнікава, — бо адно з галоўных патрабаванняў да мужчын-мадэляў — добрая фізічная форма... Але пры адборы на конкурс «Містар свету» вызначальную ролю мае ўсё ж знешнасць, бо гэта конкурс прыгажосці, а не Алімпіяда. У Міхаіла знешнасць, мы лічым, якраз конкурсная — мяркуючы па папярэдніх пераможцах (іспанец Хуан Гарсія Пасціга, бразілец Густава Джанэці), запатрабаваны гэткі экзатычны тып мужчын. Таму мы адмовіліся ад выбару тыпова беларускага хлопца — са светлымі вачыма і валасамі, і пастараліся падабраць канкурэнтаздольнага ўдзельніка. Думаю, Міхаіл пастаіць і за сябе, і за нашу краіну. Трэба толькі падцягнуць англійскі і адрасціць валасы крыху, каб вобраз быў не такі брутальны.

— Як вы паставіліся да таго, што сына абралі ўдзельнікам конкурсу прыгажосці — гэта мужчынская ўвогуле справа? — пацікавіліся мы ў бацькі і трэнера.

— Ну, калі конкурс называецца «Містар», а не «Міс», то гэта мужчынская справа, — разважае Міхаіл-старэйшы. — Таму я паставіўся нармальна, бо лічу сына гэтага вартым: мужнасці яму не займаць, пастаяць за сябе і сваю каханую дзяўчыну ён таксама зможа, а яшчэ ў яго ёсць такая не самая папулярная сёння ўласцівасць, як прыстойнасць. Таму сорамна за яго не будзе ні мне як бацьку, ні краіне. Я, са свайго боку, як спартсмен, якому давялося выступаць яшчэ за Савецкі Саюз, стараюся патлумачыць сыну, што калі едзеш на спаборніцтва — яго трэба выйграць, а не паўдзельнічаць «для галачкі».

У смокінгах і без алкаголю

З чаго ўвогуле складаецца сістэма адбору фіналістаў на конкурсе «Містар свету»? «Нам самім пакуль што гэта не вельмі зразумела, будзем арыентавацца на конкурсы, якія былі ў мінулы і пазамінулы раз, — адказвае Вольга Сяржнікава. — Ведаем, што будзе шмат спаборніцтваў — перацягванне каната, плаванне, гонкі на каноэ і г.д., таксама канкурсанты будуць шмат падарожнічаць па краіне і ўдзельнічаць у розных акцыях». У фінале, прызначаным на 27 сакавіка, не абыдзецца і без дэфіле — праўда, не ў купальніках (на жаль і ах, гэта выключна жаночая доля), а ў смокінгах і адмысловых тэатралізаваных яркіх касцюмах. Яны ж пазбавілі мужчын ад конкурсу талентаў — дэкламаваць, спяваць або танчыць на сцэне канкурсантаў не прымушаюць. Затое ім давядзецца дэманстраваць сілу, стойкасць, кемлівасць і ўменне знаходзіць выйсце з самых складаных сітуацый.

— А як жа патрабаванні да знешнасці, параметраў канкурсантаў — няўжо іх увогуле не існуе? — прывучаныя славутымі «90-60-90» да стандартызацыі прыгажосці, мы вырашылі, што Вольга Сяржнікава проста забылася расказаць пра гэты аспект. Але яна агаломшыла:

— Ніякіх параметраў у мужчынскіх конкурсах прыгажосці не існуе! Класічная прыгажосць, высокі рост — ад 178 і больш (у Міхаіла Баранава — 185. — **Аўт.**), але дакладных абмежаванняў па росце, аб'ёму таліі ці груднай клеткі ніхто не прад'яўляе.

Карэя для беларусаў — экзотыка, але і Беларусь для карэйцаў таксама. Таму наш удзельнік абавязкова павязе з сабой нацыянальныя сувеніры — вырабы з лёну, якія высока цэняцца ва ўсім свеце, фігуркі зуброў, нейкія драўляныя дробязі. А вось на алкаголь на конкурсе «Містар свету» накладзена строгае вета — яго ўдзельнікам катэгарычна нельга ні ўжываць, ні прывозіць як падарунак.

Міхаіл Баранаў: «Прыгажосць для мужчыны — не галоўнае!»

— Ці лёгка прыгожаму хлопцу будаваць стасункі з дзяўчатамі?

— Ёсць свае цяжкасці, але мы спраўляемся. З маёй дзяўчынай — яна гімнастка — сустракаемся ўжо два гады, і яна, дзякаваць Богу, мяне ва ўсім падтрымлівае. А ў мужчыне, лічу, галоўнае — не прыгажосць, а розум, сумленнасць і надзейнасць, каб на яго можна было абаперціся ў цяжкую хвіліну.

— Што даводзіцца рабіць, каб падтрымліваць сябе ў форме — наведваць лазню, хадзіць на спапрацэдуры?

— Лазню наведваю, гэта ўваходзіць у комплекс трэніровак па дзюдо, а вось манікюр-педыкюр не раблю, бо калі атрымаць нават нязначнае пашкоджанне на дыване, могуць быць непрыемныя наступствы. Дый за скуру, за знешнасць увогуле — дзякуй тату з мамай, а не нейкім там касметычным працэдурам.

— Адзін з конкурсаў — кулінарны. Ці часта вы бываеце на кухні?

— Па меры неабходнасці: калі трэба штосьці прыгатаваць, я гэта змагу, але не захапляюся гатоўкай.

Дарэчы, паралельна з вучобай ва Універсітэце фізкультуры хлопец атрымлівае другую вышэйшую адукацыю — у сферы турызму, і марыць заснаваць свой бізнэс, напрыклад, адкрыць сетку гасцініц.

Вольга Сяржнікава: «Правесці «Містара Беларусь»? Я толькі за!»

— Чаму ў Беларусі такі нізкі інтарэс да мужчынскіх конкурсаў прыгажосці?

— Я не сказала б, што ён нізкі. Бо мы нават не давалі ніякую інфармацыю ў прэсу, але нас усё адно атакавалі з тэлефанаваннямі: калі адбудзецца? якія ўмовы? Ці можна паўдзельнічаць у адборы? Але мы не давалі ніякіх каментараў, бо практычна адразу зацвердзілі кандыдатуру Мішы. І ўсё адно званкоў было проста мора — менш цікавіліся нацыянальным конкурсам «Міс Беларусь», чым «Містарам свету».

— Так, можа, варта чакаць нацыянальнага конкурсу «Містар Беларусь»?

— Ведаеце, я заўжды з задавальненнем. Я толькі «за», каб правесці і «Містар Беларусь», і «Міс Беларусь», бо з-за таго, што гэтых конкурсаў у нас не было, цікавасць да іх вельмі вялікая. Чаму б і не правесці?

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота аўтара.

Праект указа аб унясенні змяненняў у Правілы дарожнага руху падрыхтаваны ў Беларусі

Аб гэтым учора на сустрэчы з калектывам УП «Мінгаз» паведаміў міністр унутраных спраў Беларусі Анатоль Куляшоў, перадае БЕЛТА.

Анатоль Куляшоў нагадаў аб новаўвядзенні, якое дазваляе аформіць ДТЗ без удзелу супрацоўніка ДАІ, калі нанесены ўрон не перавышае 200 еўра. У гэтым выпадку не павінна быць пацярпелых, а таксама прэтэнзій з боку ўсіх удзельнікаў ДТЗ. Акрамя таго, згодна з новай рэдакцыяй ПДР будзе дзейнічаць патрабаванне аб атрыманні правоў на кіраванне мапедам. Міністр унутраных спраў таксама паведаміў, што ў Беларусі ў 2011 годзе будзе зацверджаны ўзор новага вадзіцельскага пасведчання. Тыя правы, якія будуць уведзены з ліпеня 2010 года, — гэта пілотны праект. Прадугледжваецца, што правы міжнароднага ўзору можна будзе атрымліваць па заяўным прынцыпе, а не ў абавязковым парадку. Напрыклад, такі дакумент спатрэбіцца тым, хто выязджае на аўтамашыне за межы Беларусі.

ВІКТАР ЯНУКОВІЧ УЖО 40 ГАДОЎ ВЫРАБЛЯЕ... АСФАЛЬТ, А Ў ЮЛІІ ЦІМАШЭНКІ КОЖНЫ РАНАК ПАЧЫНАЕЦЦА... У РАДЗІЛЬНІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пры тым, што і магчымай роднаснай сувязі з украінскім Віктарам Фёдаравічам беларус таксама не адмаўляе, толькі загадкава ўсміхаецца:

— Сам я родам з Віцебшчыны. За кіламетраў пятнаццаць ад маёй вёскі знаходзіцца вёска Янукі, адкуль паходзіць род майго цёзкі. Так што ўсё можа быць.

У вольны час беларускі Віктар Януковіч любіць «саджаць агародзікі і корпацца ў аўтамабілях». Паводле слоў мужчыны, за свае 60 гадоў ён змяніў ужо 18 машын, цяпер ездзіць на дзевятнаццатай. Фёдаравіч — старэйшы сын з чатырох. Так што яшчэ як мінімум тры Януковічы жывуць у Беларусі.

Беларускі Януковіч любіць парыцца ў лазні і з настальгіяй узгадвае былыя часы, калі ў яго роднай вёсцы стаяла лазня, якую і цяплілі па чарзе, мыючыся па чатыры-пяць сем'яў за раз. А яшчэ Януковіч-беларус баіцца вышыні:

— З парашутам бы не скокнуў — вышыні баюся. Хоць у арміі служыў, але парашуты не для мяне, я ў ракетных войсках быў. Гэта яшчэ ў 1968-м было.

Ва ўкраінскага Януковіча ёсць свой перадвыбарны сайт, але беларус Януковіч пра яго не ведае. Інтэрнэтам, як і камп'ютарам, мужчына не карыстаецца:

> **Як высветлілася, ёсць цёзкі і ў звяздоўцаў: як мінімум дваіх у Беларусі клічуць Уладзімір Здановіч, Вольга Цыбульская, Настасся Занько, Сяргей Грыб, Наталля Карпенка, Сяргей Расолька, Вольга Мядзведзева, Святлана Барысенка і Валянціна Доўнар...**

— За навінамі сачу па тэлевізары, чытаю газеты. Вось толькі зрок пачаў садзіцца, таму акуляры вымушаны насіць.

Маё пытанне пра паблажкі за кошт знакамітага прозвішча беларус з усмешкай парыруе:

— Ды якое там. Толькі калегі часам падколваюць: «Калі ты ўжо пачнеш кіраваць?»

Свой прагноз па выбары прэзідэнта Віктар Фёдаравіч робіць таксама на карысць Януковіча:

— Думаю, што прэзідэнтам стане мой цёзка. Ён чалавек харошы, яму людзі павераць. І ўзаемаадносіны з Расіяй і Беларуссю, думаю, ён зможа наладзіць.

Напрыканцы Віктар Фёдаравіч дадае: «А галоўнае, каб здароўе было. Будзе здароўе — будзе і мір, і дружба, і ўсё астатняе».

Ёсць у анамастыцы такая рэч, як фонасемантычны аналіз. Маўляў, кожнае прозвішча пры яго вымаўленні робіць на чалавека падсвядомы ўплыў. Паводле такога аналізу, які на сайце **analizfamilii.ru** можа зрабіць любы ахвотны, прозвішча Цімашэнка валодае характарыстыкамі «ціхае», «слабое» і «сумнае», у той жа час для прозвішча «Януковіч» сайт падае адпаведнікі «храбрае», «вялікае» і «добрае». Невядома, ці можна гэтаму аналізу верыць, але прозвішча дзейнага прэзідэнта Украіны Віктара Юшчанкі валодае адзеннямі «жаноцкае», «добрае» і «бяспечнае».

Хто пераможа ў барацьбе паміж «вялікім»-Янь і «ціхай»-Інь, украінцы вырашаць 7 лютага падчас другога туру прэзідэнцкіх выбараў.

Ілья ЛАПАТО.

55,5 ТЫСЯЧЫ ПАЧКАЎ КАНТРАБАНДНЫХ ЦЫГАРЭТ

Расіянін на грузавіку «Вольва», які належыць літоўскай фірме, спрабаваў праз Беларусь правесці больш за 55,5 тысячы пачкаў цыгарэт расійскай вытворчасці коштам прыкладна каля 140 мільёнаў рублёў.

Як паведаміў «Звяздзе» **намеснік начальніка ўпраўлення барацьбы з эканамічнымі злачынствамі УУС Віцебскага аблвыканкама Андрэй САЛАЎЁЎ,** грузавік спынілі ля трох гадзін дня супрацоўнікі ДАІ і міліцыі ля пасёлка Ветрына Полацкага раёна. Вінаватаму кіроўцы пагражае штраф да 50 базавых велічыняў, а цыгарэты канфіскуюць. Сёлета гэта пакуль што самая буйная партыя кантрабандных цыгарэт.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Абзац

◢ У падрыхтаваным праекце ўказа аб унясенні змяненняў у Правілы дарожнага руху плануецца змяніць тэрміны падачы медыцынскіх даведак для вадзіцеляў. Тыя, хто перавозіць асабліва небяспечныя грузы, павінны будуць праходзіць медагляд раз у 3 гады, кіроўцы, якім больш за 50 гадоў — раз у год. Усе астатнія павінны будуць звяртацца па даведку па-ранейшаму адзін раз у пяць гадоў. Пры гэтым, як адзначыў учора міністр унутраных спраў Беларусі Анатоль Куляшоў, вадзіцелі павінны будуць заўсёды мець пры сабе медыцынскую даведку.

◢ Пацыент па віне магілёўскага лжэстаматолага застаўся без пярэдніх зубоў. 56-гадовы магіляўчанін вырашыў ажыццявіць мару свайго дзяцінства — стаць урачом-стаматолагам. Для гэтага ён набыў у Санкт-Пецярбургу адпаведны дыплом. Праўда, вырашыў яго выкарыстоўваць на практыцы толькі праз тры гады, калі ў 2009-м страціў працу. На дзверы пад'езда свайго дома лжэўрач размясціў аб'яву аб аказанні платных паслуг насельніцтву па пратэзаванні зубоў. Стаматалагічны кабінет ён абсталяваў у сваёй кватэры. Неўзабаве да яго звярнуўся сусед з просьбай уставіць пярэднія зубы. Гора-стаматолаг вырабіў пацыенту зубны пратэз і ўзяў за працу Br510 тыс. У сувязі з няякасным пратэзаваннем пацыент вымушаны быў звярнуцца ў дзяржаўную медыцынскую ўстанову. Кваліфікаваныя спецыялісты аказалі яму неабходную дапамогу, але давялося выдаліць і астатнюю частку пярэдніх зубоў. Пракуратура Ленінскага раёна Магілёва накіравала ў суд крымінальную справу па абвінавачанні лжэўрача ў махлярстве.

◢ У Маскве прайшла цырымонія закладкі каменя на месцы будучага помніка народнаму артысту СССР Мусліму Магамаеву. Сярод шматлікіх прыхільнікаў творчасці спевака, якія прыйшлі на месца падзеі, былі віцэ-спікер Дзярждумы Любоў Сліска, народны артыст Расіі Святаслаў Бэлза, народная артыстка СССР Алена Абразцова і іншыя. М. Магамаеў памёр у 2008 г. на 67-м годзе жыцця. Пахаваны ў Азербайджане.

Поўны абзац

◢ У Марыупалі (Украіна) прадалі выбарчы ўчастак. У другім туры прэзідэнцкіх выбараў у горадзе стане на адзін выбарчы ўчастак менш. Калі ў першым туры іх было 240, то цяпер засталося 239. Рэч у тым, што цеплаход «Барыс Бабачкін», на якім быў адкрыты выбарчы ўчастак, прадалі.

23.40 «Апошні з палка закаханых. В. Зельдзін».

6.30, 12.30 Меладрама «Рабро Адама».
8.00, 14.00 Маст. фільм «Рудольфія».
8.30, 14.30 Драма «Байран. Прытча пра апантанага».
10.45, 16.45 Драма «Аднойчы схлусіўшы...».
18.30, 0.30 Камедыя «Прахіндыяда, або Бег на месцы».
20.30, 2.30 Дэтэктыў «Прывал вандроўнікаў».
22.50, 4.50 Маст. фільм «Чалавек, якому шанцавала».

3.00, 11.00, 19.00 Серыял «Асабістае жыццё доктара Селіванавай».
3.45 Маст. фільм «Старыя».
5.30 Драма «Асабістая справа суддзі Івановай».
6.50 Баявік «Бег ад смерці».
8.15 Камедыя «Цешча».
9.25 Трагікамедыя «Вялікі капкан, або Сола для кошкі пры поўні».
11.45 Маст. фільм «Вайна і мір».
15.40 Маст. фільм «Казка вандровак».
17.20 Маст. фільм «Сярэбраны самурай».
19.45 Маст. фільм «Скажы Леа».
21.05 Маст. фільм «Водпуск за свой кошт».
23.10 Маст. фільм «Сямейнае шчасце».
0.40 Дэтэктыў «Інспектар Гул».

ТВ XXI

9.00, 17.00, 1.00 Камедыя «Маці, бацькі, дзеці».
10.35, 18.35, 2.35 Трылер «Майстэрства губляць».
12.25, 20.25, 4.25 Драма «Белы алеандр».
14.20, 22.20, 6.20 Драма «З полымя і святла».
15.10, 23.10, 7.10 Камедыя «Сноўбардысты».

TV 1000

3.00, 21.00 Камедыя «Акадэмі Рашмор».
5.00 Драма «Майкл Клейтан».
7.00 Камедыя «Прынцэса лёду».
9.00 М/ф «Кніга джунгляў 2».
11.00 Драма «Эвелін».
13.00 Меладрама «Мост у Церабіцію».
15.00 Драма «Хардбол».
17.00 Камедыя «Караліна».
19.00 Драма «Сцёртая рэчаіснасць».
23.00 Камедыя «Дрэнны Санта».
1.00 Драма «Вытанчаная эпоха».

5.00 М/ф.
6.00 М/ф «Касмічныя выратавальнікі лейтэнанта Марша».
6.20 М/ф «Кураж — баязлівы сабака».
6.50 М/ф «Чарапашкі ніндзя».
7.40 М/ф «Гаджэт і Гаджэціны».
8.30 Маст. фільм «Зялёны фургон».
11.30 Серыял «Мерлін».
13.30 Серыял «Востраў Харпера».
15.15 Маст. фільм «Мадмуазэль мушкецёр».
19.00 Маст. фільм «Поле бітвы — зямля».
21.30 Маст. фільм «30 дзён ночы».
23.45 Маст. фільм «Выкрадзеныя».
1.45 Маст. фільм «Карназаўр».
3.30 Пакой смеху.
4.00 Relaks.

zone romantica

7.00, 19.35, 1.50 «Ідэальная пара».
7.55 «Жонка Іуды».
12.20 «Смачнае захапленне».
13.20 «Ніколі не позна?».
17.50 «Казачны прынц».
18.40 «Марыя Роса».
20.30 «Мужчынскія гісторыі, адрасаваныя жанчынам».
21.30 «Такое жыццё».
22.25 «Каханы па найме».
0.00 «Дона Флор і два яе мужы».
0.55 «Прысутнасць Аніты».
2.40 «У пошуках бацькі».

7.30, 23.10 Квантавы скачок.
11.45, 18.20 Сховішча.
13.25 Склад № 13.
15.05 Пункт прызначэння — праўда.
16.45 Маст. фільм «Даліна Твістэр».
20.00 Маст. фільм «Гідра».
21.35 Маст. фільм «Штосьці з космасу 2».
1.40 Кароткаметражныя фільмы.

5.00, 9.00 Фільм-казка «Пасля дожджычку, у чацвер...».
6.15, 10.15, 14.15 Мультсерыял «Самы маленькі гном». М/ф: «Прадзелкін у школе», «Тры мяшкі хітрасцяў», «Вясёлая карусель» № 2.
7.00, 11.00 М/ф: «Кот у ботах», «Начная кветка», «Агурочны конік», «Ваня і кракадзіл», «Ліса, мядзведзь і матацыкл з каляскай».
8.00, 12.00 Мультсерыял «Супергероі»; М/ф: «Дождж», «Чуня», «Ці то птушка, ці то звер».
13.00, 15.00 Маст. фільм «Аповеды пра Кешку і яго сяброў».
16.20 Мультсерыял «Самы маленькі гном». М/ф: «Стадыён шывараt-навыварат», «Кім быць?», «Клубок».
17.00 М/ф «Снежная каралева».
18.05 М/ф: «Храбры кравец», «Казка дзядулі Ай-По».

ЗДОРОВОЕ ТВ

5.00, 17.30 Я расту.
5.35, 10.20, 18.05, 0.45 Правілы здароўя.
6.00, 18.30 Практыка здароўя.
6.35 Застаца ў жывых 2.
7.05, 9.10, 23.35 Набалелае пытанне.
7.45 Кабінет прыгажосці.
8.15 Сакрэты здароўя.
8.40, 23.05 Пачуцці чалавека.
9.50, 0.15 Выкрыццё прадуктаў.
10.45, 1.10 Дзіця нарадзілася.
11.15, 1.40 Цела чалавека.
11.50 Алергія.
12.45, 3.15 Будзем здаровыя.
13.20, 3.45 Клінічны гіпноз.
13.50, 4.15 Панацэя.
14.20 Я чакаю дзіця.
14.55 Гісторыя хваробаў.
15.25 Курс лячэння.
16.00, 19.35 Увага, ежа!
16.25 Я перамог гэты боль.
17.00 Колькі вам гадоў?
19.00 Не выходзячы з дома.
20.00 Выдаткі вытворчасці.
20.30 Вялікая прабежка.
21.00 Лінія жыцця.
2.10 Нетрадыцыйная медыцына.
2.40 Школа розуму.
4.45 Энцыклапедыя памылак.

ТДК

6.00, 10.50, 11.50, 12.50, 16.50, 17.50, 18.50, 22.00, 22.55 Парады ТДК.
6.35, 14.00 Усё лепшае, для Вас.
7.35, 10.00, 17.00, 1.00 Красуня.
8.00 Добрай раніцы, Каханая!
9.00, 3.00 Гісторыі поспеху.
11.00, 2.00 Нашы дзеці.
12.00, 18.00, 22.10, 5.00 Ваш доктар.
13.00 Тэлекрама.
13.30, 22.30 Дом жывых гісторый.
15.00, 4.00 Твой дом.
15.55, 20.00 Ваш асабісты псіхолаг.
19.00 Люстэрка жыцця.
21.00 Сэксуальная рэвалюцыя.
23.05 «Знакі лёсу».

Discovery

7.00, 14.20 Вялікія і хуткія.
7.55, 0.00 Выжыць любой цаной.
9.45, 1.00 Рачныя монстры.
10.40, 20.00 Гіганцкія будоўлі.
11.35, 19.00 Крутыя выбухі.
12.30, 18.00 Мегабудоўлі.
13.25, 23.00, 4.45 Махінатары на трасе.
15.15, 21.00, 5.10 «Амерыканскі чопер».
16.10, 22.00, 6.05 Круты цюнінг 2008.
17.05 Цікава пра ўсё.
17.30 З чаго гэта зроблена?
2.00 Мяне ўкусілі.
2.55 Лютасць!
3.50 Аляска.

NATIONAL GEOGRAPHIC CHANNEL

5.00, 23.00 «Ліхтугі за мяжой».
6.00 «Невядомае падарожжа Дарвіна».
7.00 «Небяспечныя сустрэчы».
8.00 «Малпы ў горадзе!».
9.00 «Апошняя львіца».
10.00 «Анатомія найбуйнейшых жывёл».
11.00 «Туземцы ў Англіі».
12.00 «Святло на краі зямлі».
13.00 «Усё пра мядзведзяў».
14.00 «Усё пра змей».
15.00 «Вядомы сусвет».
18.00, 4.00 «Інжынерныя ідэі».
19.00, 0.00 «Расследаванні авіякатастроф».
20.00, 1.00 «Байкеры — выратавальнікі жывёл».
21.00, 2.00 «Амерыканскія гонкі».
22.00, 3.00 «Мяжа».

travel channel

7.00, 12.00, 17.00, 23.00, 4.00 Сусветны падарожнік.
8.00, 15.30, 22.00 Пра галоўнае.
9.00, 18.00 Раскошныя падарожжы.
10.00 Падарожжы па месцах вінаробства — Аўстралія.
11.00 Святочная Індыя.
11.30 Падарожнічайце сёння.
13.00, 21.00, 2.00 Планета ежы.
14.00, 19.30, 1.00 Шэф-кухар за мяжой.
15.00 Флойд адкрывае.
19.00 Смак Перу.
0.00 Сусветная адысея Джуліяна і Камілы.
3.00 У пошуках невядомага.
6.00 Бушуючая планета.
6.30 ФотаДаследчыкі.

ANIMAL PLANET

7.00 Вуліца лемураў.
7.25, 12.15 «Ветэрынарная «хуткая дапамога».
7.50, 12.45 «Самыя забаўныя жывёлы планеты».
8.45 Тэрыторыя жывёл.
9.40, 6.10 Выратаванне жывёл у Аўстраліі.
10.05, 22.55, 3.30 Паліцыя Маямі: аддзел па абароне жывёл.
10.55, 5.20 «Аддзел абароны жывёл — Паўднёвая Афрыка».
11.50, 6.35 «Ветэрынары на маршы».
13.40 Сабакі-паліцэйскія.
18.15 Зусім дзікія.
19.10 Перад тварам небяспекі.
20.10 Дзікі крымінал.
21.05, 22.00, 1.40, 2.35 Дзікія і небяспечныя.
23.50, 4.25 Я выжыў.
0.45 «Пад покрывам ночы».

Зімовыя Алімпійскія гульні
4.00, 9.25, 13.30 Цырымонія адкрыцця Зімовых Алімпійскіх гульняў.
7.00, 8.20, 12.00, 17.30, 19.30, 0.30 Скачкі на лыжах з трампліна.
7.30, 8.10, 9.20 Навіны.
7.40, 16.30, 21.30 Горныя лыжы.
13.00, 16.00, 18.30 Фінішная прамая.
19.00 Адваротны адлік.
23.00, 2.00 Біятлон.
0.15 Канькабежны спорт.
3.00 Шорт-трэк.

MTV

5.00, 1.00 Music.
6.00 Стэрэа_раніца. The Best.
9.15, 19.30 «Аватар».
10.05 «20 страшных любоўных злачынстваў».
11.00 Наступны.
11.25 MTV Top 20.
12.25, 20.25 Тачку на пракачку.
12.50 Віртуаліці.
13.20 Тэлепорт.
13.50 Зоркі на далоні.
14.50 Гарачае кіно.
14.50 Мой клон: Mariah Carey.
15.15 Доктар Галівуд.
16.05 Уся праўда пра Heath Ledger.
17.00 Маст. фільм «Сабачае каханне».
18.40, 23.20 «Губка Боб квадратныя штонікі».
21.15 Падстава.
21.40 Зорны бой насмерць.
22.30, 0.35 «Паўднёвы парк».
0.10 «Кругасветка ў пошуках непрыемнасцяў».

ІНТЕР+

7.00 Вялікая палітыка з Яўгенам Кісялёвым.
9.10 Картата — патата.
9.50 М/ф «Дванаццаць месяцаў».
10.45 Феерыя падарожжаў.
11.05 Парк аўтамабільнага перыяду.
11.35 Украінская топ-дваццатка.
12.50 Вяселле для цябе.
13.20 Дак. фільм «Хімія вайны».
14.15 Маст. фільм «Правінцыяльны раман».
16.30, 22.45, 5.45 Пазавочы. С. Пенкін.
17.10, 0.15 Камедыйны клуб.
18.25, 1.30 Маст. фільм «Дзе там».
20.00, 3.00 «Падрабязнасці».
20.30, 3.30 Канцэрт С. Пенкіна «Мне не забыць цябе».
23.30 Тыдзень моды.
6.25 Парк аўтамабільнага перыяду.

1+1

6.00 «Украінскія мультфільмы».
6.15 «Лятучы дом».
7.05 «Без табу з Вольгай Герасімюк».
7.55 «Свецкае жыццё».
9.05 «Хто там?».
10.15 «Качыныя гісторыі».
11.15 М/ф «Кевін у краіне драконаў».
12.40 Серыял «Прыгоды Мерліна».
14.35 «Шэсць кадраў».
15.10 Камедыя «Звар'яцелая нянька».
17.15, 20.00, 2.20 Меладрама «Закон адваротнага чараўніцтва».
19.30 ТСН.
22.05 Меладрама «Арэлі».
0.00 Баявік «Чужыя».
5.35 «Караоке на майдане».

16.00 ФІЛЬМ ДНЯ

«БРАТЫ ГРЫМ»
(ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ — ЧЭХІЯ — ЗША, 2005 Г.)

XIX стагоддзе. Германія акупаваная французскімі войскамі. Браты Уіл і Джэйк — дробныя жулікі, якія зарабляюць на жыццё выгнаннем "нечысці". Аднойчы яны трапляюць у рукі да французскага генерала, які прымушае іх заняцца выкрыццём куды больш маштабнага махлярскага чараўніцтва: у адной вёсцы хтосьці выкрадае дзяўчынак, паказваючы гэта як праяўленні магіі.

Рэжысёр — Тэры Гіліям. **У ролях:** Мэт Дэйман, Хіт Леджэр, Моніка Белучы, Джонатан Прайс, Пітэр Стормарэ.

НЯДЗЕЛЯ, 14 ЛЮТАГА

7.35 Фільм-казка «Прынцэса на гарошыне».
9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
9.05 Арсенал.
9.35 «Зброя».
9.50 Альманах падарожжаў.
10.20 Культурныя людзі.
10.55 «У свеце матораў».
11.30 « Nota Bene».
12.10 Дзённік Алімпіяды.
12.35 Камедыя «Утаймавальніца тыграў».
14.30 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
15.10 Навіны рэгіёна.
15.30 «Bravissimo, Андрэй! Адлюстраванне зніклага часу».
15.55 «Гараскоп кахання». Святочны канцэрт да Дня святога Валянціна.
18.00 «Суперлато».
19.15 «Мая праўда». «Барбара Брыльска».
20.30 «Спартлато 5 з 36».
20.50 «КЕНО».
21.00 «У цэнтры ўвагі».
22.05 Дак. цыкл «Зорнае жыццё». «Аголеныя зоркі».
22.55 Алімпійскія гульні. Гарналыжны спорт. Жанчыны. Канькабежны спорт. 3000 м. Жанчыны.

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 Нядзельная пропаведзь.
9.20 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».
9.55 «Бесталковыя нататкі».
10.15 Пакуль усе дома.
11.05 Фазэнда.
11.40 «Ранішняя пошта».
12.15 «Разумніцы і разумнікі».
13.00 «Песні Перамогі». «Колер яблычка».
13.30 Маст. фільм «Экіпаж».
16.15 Навіны спорту.
16.20 Меладрама «Варачка».
18.00 Упершыню ў колеры. Маст. фільм «Волга-Волга».
20.00 Контуры.
21.05 Дыханне планеты.
21.40 Цырымонія ўручэння прэміі «Залаты грамафон».

5.25 Алімпійскія гульні. Фрыстайл. Жанчыны. Фінал.
6.45 Звон.
7.10 Мір вашаму дому.
7.20 Смачна з Барысам Бурдой.
7.40 Меладрама «Спакуса».
9.20 Дак. фільм «Дарагія лялькі».
10.00 Школа рамонту.
11.00 Урачэбныя тайны з доктарам А. Цярэшчанкам.
11.45 Кінапробы.
12.05 Бухта капітанаў.
12.40 Правы чалавека. Аўтарская праграма Яўгена Новікава.
12.55 Гаспадар.
13.25 Дак. фільм «Проста Хлеб».
13.55 Серыял «Сяброўка банкіра».
17.40 Камедыя «Інтуіцыя».
19.20 Экспедыцыя.
19.55 Алімпійскія гульні. Гарналыжны спорт. Жанчыны. Біятлон. Спрынт. Мужчыны.
22.35 Тэлебарометр.
22.55 Свая музыка. Працяг.
23.25 ПРАсоўванне+.

7.05 Серыял «Агенцтва 2».
7.55 Камедыя «Алекс і Эма».
9.30, 19.00 «Аўтапанарама».
10.00 «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
10.55 «Вялікае снеданне».
11.30 «Салдаты. Залатыя серыі».
13.15 «Добры дзень, доктар!».
13.45 «Дарагая перадача».
14.05 Маст. фільм «Тэатр».
16.30 «24 гадзіны».
16.50 «Рэпарцёрскія гісторыі».
17.20 Канцэрт Міхаіла Задорнава.
19.30 «Тыдзень».
20.40 Маст. фільм «Палюбоўнікі».
22.40 Тэніс. Кубак Федэрацыі-2010. Партугальскі вяжа.
23.10 Маст. фільм «Два дні ў Парыжы».
0.50 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

4.55 «Білет на сёння».
5.05, 13.00 Серыял «Закон Мерфі».
6.00, 11.10 «Любімыя акцёры».
6.10, 11.20 Камедыя «Мой муж іншапланецянін».
8.00 Мультсерыял «Паляўнічыя на драконаў».
8.30 «АБВГДэйка».
9.00, 15.00 Навіны Садружнасці.
9.10 «Свет анімацыі — анімацыя свету».
9.40 Серыял «Біндзі: дзяўчынка з джунгляў».
10.10 «Ведаем рускую».
14.00, 0.15 «Дакументальны дэтэктыў. Дзённік забойцы. Удаў».
15.10 «Дыяспара».
15.40 Маст. фільм «Індакітай».
18.30 Простыя лічбы. «Ілья Ільф і Яўген Пятроў: дуэт векавой вытрымкі».
19.00, 1.45 Серыял «Абаронца».
20.00 «Разам».
21.00, 1.15 «Паўночнікі».
21.40, 4.00 Канцэрт гурта «A'STUDIO».

22.40, 3.00 Серыял «Усё золата свету».
23.45 «Даведнік».

9.00, 23.35 «Надвор'е».
9.15 «Мой любімы гадаванец».
9.45, 19.20, 23.20 «Алімпіяда 2010. Ванкувер».
10.00, 17.00 «Навіны кіно».
10.15 «Адшукваецца адпачынак».
10.45 Камедыя «Начныя хады».
12.45 «Пляткарка».
13.00 Серыял «Пуаро Агаты Крысці».
14.00 Канцэрт «Па вашых просьбах».
14.50 «К-відэа» для дзяцей.
15.15 Фільм для дзяцей.
16.30 Серыял «Альф».
17.20 Серыял «Мора душ».
19.35 Серыял «Прафесіяналы следства».
20.50 «Вечарніца».
21.05 «К-відэа» для ўсёй сям'і.
21.10 Камедыя «Птушка на провадзе».

6.00, 23.30 «PLAY».
11.00, 20.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
13.00 Серыял «Кадэцтва».
18.00 Серыял «Татавы дочкі».

РТР

7.00 «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
7.30 Мультфільмы.
7.55 Маст. фільм «Пяшчотны Барс».
11.00, 14.00, 19.00 Весткі.
11.10 «Сам сабе рэжысёр».
12.00 «ХА». Маленькія камедыі.
12.20 Маст. фільм «Ты памятаеш».
14.15 «Смехапанарама».
14.45 «Запаветны камень Барыса Макравусава».
15.30 Маст. фільм «Вялікая сям'я».
17.20 «Смяяцца дазваляецца».
20.05 «Сумленны дэтэктыў».
20.40 «Танцы з Зоркамі».
23.05 «Спецыяльны карэспандэнт».
0.00 Маст. фільм «А вы яму хто?».

НТВ

5.45 Трылер «Знак».
7.40 Мультфільм.
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.20 «Дзікі свет».
8.50 «Іх норавы».
9.25 «Ядзім дома!».
10.20 «Выратавальнікі».
10.50 «Асабліва небяспечны!».
11.25 «Першая кроў».
11.55 «Дачны адказ».
13.20 «Крамлёўская кухня». Камунальнае жыццё.
14.10 Баявік «Дом гневу».
16.25 Серыял «Адвакат».
17.15 «І зноў добры дзень!».
18.05 «Прафесія — рэпарцёр».
18.25 «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
19.55 «Чыстасардэчнае прызнанне».
20.30 Серыял «Следапыт».
0.05 «Авіятары».

ТНТ

5.00 «Эй, Арнольд!». Мультсерыял.
6.00 «Прыгоды Джымі Нейтрона, хлопчыка-генія». Мультсерыял.
7.25 Серыял «Саша + Маша».
8.00 «Невытлумачальна, але факт».
8.55 «Першая Нацыянальная латарэя».
9.00 «Школа рамонту».
10.00 «Школьнае каханне». Дак. фільм.
11.00 «Інтуіцыя».
12.00 Фэнтэзі «Браты Грым».
14.30 «Універ». Сітком.
16.30 Меладрама «Крок наперад».
18.30 Камедыя «Наша Russia».
19.00 Мюзікл «Крок наперад-2: вуліцы».
20.50 «Забойная ліга».
22.00, 1.05 «Дом-2».
23.00 «Comedy Woman».
0.00 «Смех без правілаў».
1.35 «Сэкс» з Анфісай Чэхавай.
2.05 Камедыя «Осцін Паўэрс: чалавек-загадка міжнароднага маштабу».
4.00 «Начныя гульні».

КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00, 0.50, 1.50 Праграма перадач.
9.10 «Звычайны канцэрт» з Эдуардам Эфіравым.
9.40 Маст. фільм «Выпрабавальны тэрмін».
11.15 «Легенды сусветнага кіно». Вів'ен Лі.
11.45 «Набытак рэспублікі».
12.00 М/ф: «Казка пра цара Салтана», «Бобік у гасцях у Барбоса».
13.05, 0.55 «Жыццё з ваўкамі». Дак. фільм.
14.00 «Што рабіць?».
14.50 «Ты бачыш, перамены лёс мне не даў».
15.30 С. Пракоф'еў. Балет «Рамэа і Джульета».
18.20 «Павел Цімафеевіч Лебешаў. Незакончаная п'еса...» Дак. фільм.
19.00 Маст. фільм «Незакончаная п'еса для механічнага піяніна».
20.40 Вялікія раманы XX стагоддзя. Кэтрын Хепберн і Спенсер Трэйсі.
21.10 Маст. фільм «Роза Люксембург».
23.15 «Джэм-5». Дзізі Гілеспі.
0.10 «Сусветныя скарбы культуры». Дак. фільм.
0.30 «Як адзін мужык двух генералаў пракарміў». М/ф для дарослых.

НОСТАЛЬГИЯ

6.00, 10.00, 15.00, 1.00 «Мінулы час».
6.50, 9.40, 14.50, 5.50 «Ералаш».
7.10, 3.15 «Будзільнік».
7.40, 3.45 «Родны голас». Фільм-канцэрт.
8.25, 4.30 «Тэма» з Уладам Лісцьевым. 1993 год.
9.05, 5.10 «Ранішняя пошта».
11.00, 2.00 «Народжаны ў СССР».
12.10 «Да і пасля...».
13.30 «Шынок «13 крэслаў». 1973 год.
16.00 «Замежная эстрада».
16.30 «Відавочнае — неверагоднае». 1977 год.
17.15 «Рытмічная гімнастыка».
17.45 «Закаханым пра закаханых». Канцэрт. 1993 год.
18.15 Маст. фільм «Вам і не снілася...».
19.45, 0.45 «Добрай ночы, малыя».
20.00 «Быў час».
21.00 «Ганна Герман. Лёс і песні». Дак. фільм.
22.15 «Да 70-годдзя Нэльсана Мандэлы». Канцэрт. 1988 год.

НАШЕ КИНО

6.30, 12.30 Камедыя «Прахіндзіяда, або Бег на месцы».
8.30, 14.30 Дэтэктыў «Прывал вандроўнікаў».
10.50, 16.50 Маст. фільм «Чалавек, якому шанцавала».
18.30, 0.30 Меладрама «Познія спатканні».
20.30, 2.30 Маст. фільм «Гоя, або Цяжкі шлях пазнання».
22.45, 4.45 Камедыя «Бабнік».

2

3.00, 11.00 Серыял «Асабістае жыццё доктара Селіванавай». Заключная серыя.
3.45 Трылер «Шатун».
5.35 Мюзікл «Сватаўство гусара».
6.40 Кінараман «Хлопцы».
8.15 Маст. фільм «Цыклон» пачнецца ноччу».
9.30 Маст. фільм «Слёзы капалі».
11.45 Маст. фільм «Вайна і мір».
14.35 Дэтэктыў «Мільёны Ферфакса».
16.00 Камедыя «Не можа быць!».
17.35 Маст. фільм «Даравание».
19.00 Серыял «Танцор».
19.55 Маст. фільм «Гастралёр».
21.15 Маст. фільм «Забіць дракона».
23.10 Трылер «Аварыя».
1.25 Маст. фільм «Па Русі».

ТВ XXI

9.00, 17.00, 1.00 Меладрама «Давайце патанцуем».
11.00, 19.00, 3.00 Мюзікл «Прывід оперы».
13.25, 21.25, 5.25 Драма «Эрас».
15.15, 16.05, 23.15, 0.05, 7.15, 8.05 Драма «З полымя і святла».

TV 1000

3.00, 21.00 Камедыя «Школа спакушэння».
5.00 Драма «Сцёртая рэчаіснасць».
7.00 Драма «Хардбол».
9.00 Меладрама «Мост у Церабіцію».
11.00 Камедыя «Караліна».
13.00 Драма «Так яна знайшла мяне».
15.00 Камедыя «Сем'янін».
17.00 Камедыя «Прывет, Біл!».
19.00 Камедыя «Толькі ты і я».
23.00 Драма «Можаш разлічваць на мяне».
1.00 Драма «Смешна, ха-ха».

ТВ 3

5.00 М/ф.
6.00 М/ф «Касмічныя выратавальнікі лейтэнанта Марша».
6.20 М/ф «Кураж — баязлівы сабака».
6.50 М/ф «Чарапашкі ніндзя».
7.40 М/ф «Чалавек-павук».
8.30 Маст. фільм «Пунсовая кветачка».
10.00 Маст. фільм «Поле бітвы — зямля».
13.00 Серыял «Перагаворшчыкі».
14.30 Дак. фільм «Тайны вялікіх магаў».
15.30 Маст. фільм «Бездань».
18.00 Дак. фільм «Гарадскія легенды. Ваганькава».
19.00 Маст. фільм «Цудоўная афера».
21.30 Маст. фільм «Імя ружы».
23.15 Маст. фільм «Выкрадзеныя».
2.15 Маст. фільм «Карназаўр-2».
4.00 Relaks.

zone romantica

7.00, 19.35, 1.50 «Ідэальная пара».
7.55 «Стол на траіх».
12.20 «Гатуем разам з Анхелем Ласана».
13.20 «Рэванш-II».
17.50 «Казачны прынц».
18.40 «Марыя Роса».
20.30 «Мужчынскія гісторыі, адрасаваныя жанчынам».
21.30 «Такое жыццё».
22.25 «Каханы па найме».
0.00 «Дона Флор і два яе мужы».
0.55 «Прысутнасць Аніты».
2.40 «Плата не па заслугах».

Sci Fi

7.30, 23.20 Геракл: Легендарныя падарожжы.
11.50 Прытворшчык.
15.10 Маст. фільм «Штосьці з космасу 2».
16.45 Сховішча.
18.25 Маст. фільм «Даліна Твістэр».
20.00 Маст. фільм «Смяротны ўдар».
21.40 Склад № 13.
1.50 Кароткаметражныя фільмы.

5.00, 9.00 Маст. фільм «Уся справа ў браце».
6.15, 10.15, 14.20 Мультсерыял «Самы маленькі гном». М/ф: «Стадыён шыварат-навыварат», «Кім быць?», «Клубок».
7.00, 11.00 М/ф «Снежная каралева».
8.05, 12.05 М/ф «Храбры кравец», «Казка дзядулі Ай-По», «Карцінкі з выстаўкі».
13.00, 15.00 Маст. фільм «Аповеды пра Кешку і яго сяброў».
16.20 Мультсерыял «Самы маленькі гном». М/ф: «Дзіцячы альбом», «Адзін конік белы».
17.00 М/ф «Лапландскія казкі».
18.15 М/ф: «Папялушка», «Танюша, Цяўка, Топ і Нюша».

ЗДОРОВОЕ ТВ

5.00, 17.30 Не выходзячы з дома.
5.35, 18.05, 19.35 Увага, ежа!
6.00, 18.30 Выдаткі вытворчасці.
6.35 Вялікая прабежка.
7.05 Я расту.
7.40, 12.25, 2.45 Правілы здароўя.
8.05 Практыка здароўя.
8.40, 23.00 Застацца ў жывых.
9.10, 11.15, 23.30, 1.35 Набалелае пытанне.
9.50, 0.10 Кабінет прыгажосці.
10.20, 0.40 Сакрэты здароўя.
10.45, 1.05 Пачуцці чалавека.
11.55, 2.15 Выкрыццё прадуктаў.
12.50, 3.10 Дзіця нарадзілася.
13.20, 3.40 Цела чалавека.
13.55 Алергія.
14.50 Будзем здаровыя.
15.25 Клінічны гіпноз.
15.55 Панацэя.
16.25 Я чакаю дзіця.
17.00 Гісторыя хваробаў.
19.00 Курс лячэння.
20.00 Я перамог гэты боль.
20.30 Колькі вам гадоў?
21.00 Лініі жыцця.
4.10 Нетрадыцыйная медыцына.
4.45 Энцыклапедыя памылак.

ТДК

6.00, 10.50, 11.50, 12.50, 16.50, 17.50, 18.50, 22.00, 22.55 Парады ТДК.
6.35, 14.00 Усё лепшае, для Вас.
7.35, 10.00, 17.00, 1.00 Красуня.
8.00 Добрай раніцы, Каханая!
9.00 Ранішні фрэш.
11.00, 2.00 Нашы дзеці.
12.00, 18.00, 22.10, 5.00 Ваш доктар.
13.00 Тэлекрама.
13.30, 22.30 Серыял «Гвадэлупе».
15.00 Маю права.
15.50, 20.00 Ваш асабісты псіхолаг.
19.00 Люстэрка жыцця.
21.00 Сэксуальная рэвалюцыя.
23.05 «Знакі лёсу».
3.00 Гісторыі поспеху.
4.00 Твой дом.

Discovery Channel

7.00, 4.45 Цікава пра ўсё.
7.25 З чаго гэта зроблена?
7.55, 15.15, 3.50 «Галаваломы».
8.50, 14.20, 21.00, 2.55 Разбуральнікі легендаў.
9.45 «Відавочца».
10.40 Аляска.
11.35 Выжыць любой цаной.
13.25 Рачныя монстры.
16.10, 2.00 Скрыўленне часу.
17.05 Махінатары на трасе.
18.00 Вялікія і хуткія.
19.00 Амерыканскі чопер.
20.00 Круты цюнінг 2008.
22.00 Рос Кемп. «Банды».
0.00 Жанчыны-забойцы.
1.00 Рай, які абярнуўся пеклам.
5.10 Мегабудоўлі.
6.05 Гіганцкія будоўлі.

NATIONAL GEOGRAPHIC CHANNEL

5.00, 12.00 «Самы цяжкі ў свеце рамонт».
6.00 «Шлях эвалюцыі: сухапутныя кіты».
7.00 «Небяспечныя сустрэчы».
8.00 «Малпы ў горадзе!».
9.00 «Кароль яшчарак».
10.00 «Маўчанне пчол».
11.00 «Інжынерныя ідэі».
13.00 «Нашэсце медуз».
14.00 «Гепарды».
15.00 «Мяжа».
16.00 «Укусі мяне, або Падарожжы вірусолага».
17.00 «Туземцы ў Англіі».
18.00 «Ліхтугі за мяжой».
19.00, 4.00 «Расследаванні авіякатастроф».
20.00, 22.00, 23.00, 1.00, 2.00 «З пункту гледжання навукі».
21.00, 0.00, 3.00 «Забароны».

travel channel

7.00, 12.00, 16.00, 21.00, 23.00, 1.00, 5.00 Сусветны вандроўнік.
8.00 Па чыгунках Швейцарыі.
9.00 Шляхі зносінаў.
10.00 Бясстрашныя падарожнікі.
13.00 Планета ежы.
14.00 Шэф-кухар за мяжой.
14.30 Святочная Індыя.
15.00 Флойд адкрывае.
15.30, 19.30, 3.30 Пра галоўнае.
18.00, 2.00 У пошуках згубленага снегу.
18.30, 2.30 Лыжны свет.
19.00, 22.30, 3.00 Бушуючая планета.
20.00, 4.00 У пошуках невядомага.
22.00 Круасаны ў джунглях.
0.00 Сусветная адысея.

ANIMAL PLANET

7.00 Вуліца лемураў.
7.25, 12.15 «Ветэрынарная «хуткая дапамога».
7.50 «Самыя забаўныя жывёлы планеты».
8.45 Тэрыторыя жывёл.
9.40, 6.10 Выратаванне жывёл у Аўстраліі.
10.05, 22.55, 3.30 Паліцыя Маямі: аддзел па ахове жывёл.
10.55, 5.20 Паліцыя Х'юстана — аддзел па абароне жывёл.
11.50, 6.35 «Ветэрынары на маршы».
12.45 Жывёлы, падобныя на нас.
13.40 «Загадкавыя жывёлы з Джао».
14.35 Аддзел па абароне жывёл.
15.30 «Дзённік вялікай кошкі».
16.25 «Якія жывуць з ваўкамі».
17.20 Чужак сярод мядзведзяў.
18.15 «Небяспечныя маршруты Макса».
19.10 Рай для шымпанзэ.
20.10 Прыгоды Осціна Сцівенса.
21.05, 22.00, 1.40, 2.35 Дзікія і небяспечныя.
23.50 «Галапагоскія астравы».
0.45 Кітовыя войны.
4.25 Пад покрывам ночы.

EUROSPORT

Зімовыя Алімпійскія гульні
4.00, 0.30 Шорт-трэк.
5.30 Фрыстайл.
6.30, 1.00 Санны спорт.
7.30, 8.15, 9.15 Навіны.
7.40, 11.00, 16.30, 20.00, 23.00 Горныя лыжы.
8.25, 12.00, 15.00, 21.15 Біятлон.
9.25, 13.30, 17.30 Скачкі на лыжах з трампліна.
13.00, 16.00, 19.00 Фінішная прамая.
19.30 Адваротны адлік.
22.30, 0.00 Лыжнае дваябор'е.
3.00 Фігурнае катанне.

MTV

5.00, 0.35 Music.
6.00 «Стэрэа_раніца». The Best.
9.15, 19.35 «Аватар».
10.05 Інтуіцыя супраць спакусы.
10.30 Трэндзі.
11.00 Гарачыя хлопцы ля пліты.
11.25 Вобыск і спатканне.
11.50 Ікона відэагульняў.
12.25, 20.25 Тачку на пракачку.
12.50 Маст. фільм «Сабачае каханне».
14.25 Мой клон: 50 Cent.
14.50 Доктар Галівуд.
15.45 «Праўда жыцця»: Здаецца, мы пажаніліся...
16.40 Еўропа плюс Live.
18.40, 23.20 «Губка Боб квадратныя штонікі».
21.15 Падстава.
21.40 Зорны бой насмерць.
22.30 «Паўднёвы парк».
0.10 Кругасветка ў пошуках непрыемнасцяў.

ІНТЕР

7.00 Дак. фільм «Дасье мастака».
7.40 Украінская топ-дваццатка.
8.55 Камфорт-шоу «Квадратны метр».
9.35 М/ф «Дзюймовачка».
10.05 Украіна, уставай!
10.35 Вяселле для цябе.
11.05 Тыдзень моды.
11.35 Самы разумны.
13.05 Маст. фільм «Дзе там».
14.35 Канцэрт С. Пенкіна «Мне не забыць цябе».
16.50, 6.05 Дак. фільм «Каханне супраць правілаў».
17.40, 5.20 Формула кахання.
18.25, 1.30 Маст. фільм «Круіз, або Разводнае падарожжа».
20.00, 3.00 Падрабязнасці тыдня.
20.45, 3.45 Канцэрт «Прыйшла вясна».
22.15 Дак. фільм «Гісторыі кахання. Трэці лішні».
23.10 Маст. фільм «Ніягара».
0.40 Важная роля.
1.00 Парк аўтамабільнага перыяду.

1+1

6.25 «Лятучы дом».
7.15 М/ф «Кевін у краіне драконаў».
9.05 Латарэя «Лато-забава».
10.15 «Качыныя гісторыі».
11.00, 4.45 «Караоке на майдане».
12.00 «Смакуем».
12.40 «Шэсць кадраў».
13.20 Камедыя «Не рызыкнеш — не пацалуеш».
15.20 Камедыя «Зяць».
17.15 Камедыя «Лепшы сябар майго мужа».
19.30 ТСН.
20.15 «Крывое люстэрка».
22.25 «Свецкае жыццё».
23.20 Баявік «Універсальны салдат».
1.20 Меладрама «Успаміны няўдачніка».
3.20 Меладрама «Арэлі».
5.20 Камедыя «Звар'яцелая нянька».

17.40 ФІЛЬМ ДНЯ

«ІНТУІЦЫЯ» (ЗША, 2001 г.)

«Калі лёсу будзе трэба — мы сустрэнемся зноў». І яны вырашаюць праверыць лёс: ён піша свой тэлефон на банкноце, яна — у кнізе. Купюру разменьваюць, а кнігу здаюць букіністу. Цяпер гэтыя рэчы згубяцца ў шматмільённым Нью-Ёрку, і калі кніга патрапіць да яго або банкнота да яе, то гэта значыць, што ім наканавана быць разам, калі не, то іх сустрэча была ўсяго толькі выпадковасцю...

Рэжысёр — Пітэр Чэлсем. **У ролях:** Кэйт Бекінсейл, Джон К'юзак, Леа Фіцпатрык, Джэрэмі Півен.

ОРГАНИЗАЦИЯ ПРИГЛАШАЕТ НА ПОСТОЯННУЮ РАБОТУ
РАБОТНИКОВ СТРОИТЕЛЬНЫХ И ИНЖЕНЕРНО-ТЕХНИЧЕСКИХ СПЕЦИАЛЬНОСТЕЙ.
Тел. 8(029) 572 06 58, 8(029) 667 76 71.
ООО «Трасткомпани» свидетельство о регистрации № 191113596 от 24.03.2009, лицензия № 02250/000445 до 24.08.2014 г.

Рэзананс

СКАЖЫЦЕ ДЗІЦЯЦІ «ТАК»?

НЕ магу не адгукнуцца на публікацыю Аляксандра Пятрова з Мядзельскага раёна (3 лютага), які ў сваю чаргу адгукнуўся на артыкул Вольгі Мядзведзевай «Так» або «не» (за 26 студзеня).

Калі чую некампетэнтныя (можна сказаць, бытавыя) развагі жанчын і мужчын адносна аборту, ведаю, што абавязкова выбухну!! Не тое, каб маё меркаванне было надта кампетэнтным — усё ж такі я не ўрач па адукацыі, — але ўпэўнена, што мая пазіцыя не да такой жудаснай ступені аднабокая і прымітыўная...

«Хто даў нам права караць смерцю яшчэ ні ў чым не павіннае дзіця?» — цытую я аўтара рэзананснага водгуку. Людзі, родныя! Колькі можна размазваць па талерцы досыць канкрэтную, сур'ёзную тэму, якая не можа абмяркоўвацца на ўзроўні «жанчыны, не рабіце аборт — гэта так дрэнна, гэта ж забойства жыцця!».

Дарослым людзям прыстала глядзець у вочы праўдзе па-даросламу, аб'ектыўна, разумна. Дык, калі ласка, давайце не будзем фальшыва дабрачыннымі, хлусліва дабрадзейнымі... Ганьба крывадушнікам! Можа быць, вам, спадар Пятроў, сапраўды пералічыць, ХТО і ШТО дае права жанчыне ісці на аборт?

Вельмі-вельмі разумныя людзі ведаюць, што выступленнямі супраць аборту ці яшчэ горш — забаронай апошніх — не вырашыць НІЯКІХ праблем. Ні глабальнай — дэмаграфічнай, ні індывідуальнай — сямейнай. Наадварот, адмова ад такой радыкальнай меры планавання сям'і і жыцця, прымушэнне жанчыны, тым больш, скажам, няпоўнагадовай, да выношвання нежаданай цяжарнасці (а калі мы гаворым пра аборт, значыць, абавязкова маем на ўвазе нежаданую цяжарнасць) заўсёды прыводзіць да дрэнных наступстваў. Ніхто не кажа, што аборт — гэта цудоўна. Але, у рэшце рэшт, аборт — гэта вялікае ПРАВА ВЫБАРУ.

У той жа няпоўнагадовай павінна быць права не падвяргаць свой няспелы, па сутнасці, дзіцячы арганізм найсур'ёзнай падзеі выношвання і нараджэння дзіцяці. Такія цяжарныя маюць досыць малыя шансы нармальна вынасіць і без ускладненняў нарадзіць дзіця. Не выключана, што сучасная медыцына дапаможа такой матулі зрабіць пералічанае «ў лепшым выглядзе». Але дзе гарантыя, што немаўля адразу пасля ўдалых родаў не перакачуе ў стан адмоўнікаў? І што гэта будзе ў прынцыпе за дзіця — наколькі здаровым, фізічна і разумова паўнацэнным? А псіхалагічны бок справы? Чаму мы так клапоцімся пра «рабочыя рукі» для нашай дзяржавы і зусім забываемся пра нешта куды больш важнае? Відавочна, няпоўнагадовая не можа хацець дзіця так, як хацела б пры шэрагу ўмоў: калі б яе дзетародныя органы саспелі належным чынам, калі б яна выйшла замуж і як след спланавала надыход неверагоднага цуду ў сваім жыцці!

Нехта скажа: калі б усе жылі паводле такога планавання, дык наогул бы ніхто не раджаў! Шаноўныя, праблемай кольказсці мільёнаў у нашай краіне мяне «на понт» не возьмеш. Я з тых, каго з дзяцінства цікавіла толькі якасць!

Ведаю адно: цяжарнасць нельга адбываць, да яе нельга прымушаць! Гэта — не пакаранне! Мы гаворым пра аборт, а значыць, і пра нежаданне — выражанае ў большай ці меншай ступні — канкрэтнай жанчыны любіць тое, што цалкам залежыць ад яе, а не ад грамадства ў цэлым. Будучае ненароджанага дзіцяці, ягоная магчымасць адчуваць сябе патрэбным у гэтым свеце абавязкова залежыць у тым ліку ці нават у першым ліку і ад таго, ці хацела маці гэты плод усёй душой, сэрцам, думкамі, расцяжкамі на жываце, грудзямі — раздзьмутымі да родаў і здзьмутымі пасля родаў, «вузламі» на венах, таксікозам, пагрозай невыношвання і г.д., г.д.

Што да жанчын паўнагадовых, то тут адступае толькі адзін аспект: іх здароўе цалкам дазваляе раджаць, але ўсе астатнія патэнцыйныя шкодныя наступствы застаюцца. Дарослыя жанчыны таксама могуць кінуць і, што характэрна, кідаюць дзяцей у раддоме. Яны гэтак жа здольныя нанесці сваім нежаданнем раджаць непапраўную шкоду безабароннай істоце.

Настойваю: з'яўлення дзіцяці трэба хацець! Калі ж жанчына гэтага не хоча, то адгаворваць яе ад такога непрывабнага ўчынку бессэнсоўна — толку не будзе. Не мы, староннія людзі, а цяжарная і толькі яна бярэ на сябе адказнасць за кожны свой рух, крок, учынак.

Я не прапагандую аборты як яны ёсць, але ж я ні ў якім разе не супраць іх. Я ўсяго толькі ЗА правы жанчыны займацца сэксам, рабіць у ложку са сваім мужчынам усё, што ёй хочацца... І не збіраюся, як іншыя, крывіць душой. Бо жанчына МАЕ ПРАВА «расплаціцца» за сваю легкадумнасць у ложку нечаканай цяжарнасцю, МАЕ ПРАВА не рабіць нешчаслівым непажаданае дзіця і, калі хочаце, МАЕ ПРАВА падумаць у момант высвятлення раптоўнага «дыягназу» не пра «рабочыя рукі» для краіны, а пра свае планы і магчымасці.

Аборт — заўсёды вынік. І калі б аднойчы асабіста мне давялося мець справу з такім вынікам, то цяпер нехта мог бы папракнуць мяне гэтым, маўляў, мае словы — свайго роду апраўданне колішняга ўчынку... Але я... не магу зацяжараць...

Усе жанчыны дзеляцца на тых, хто рабіў аборт (вакуумную аспірацыю) і тых, хто не ведае, што гэта такое. У ліку апошніх — галоўным чынам, тыя, хто мае пэўныя праблемы з «лёгкім зацяжарваннем». Некага «праносіць», а нехта вымушаны перажыць боль, пакуты сумлення, страх, а ў будучым, не выключана, і другасную бясплоднасць.

Я ведаю дзясяткі і дзясяткі жанчын, якія перажылі аборт. І ні для каго з іх гэта не было чымсьці нармальным, звычайным. Упэўнена, мужчынам гэтага не зразумець... Аднойчы мая маці, будучы ўжо ў шлюбе і са мной, малой, на руках спазнала, што такое «затрымка». Праз колькі дзён высветлілася, што гэта быў проста «збой», а не цяжарнасць. Але ж пакуль доўжылася тое чаканне (раней нельга было купіць у свабодным продажы папулярныя цяпер тэст-палоскі), яна паспела вымавіць у бок свайго мужа, майго бацькі... словы праклящця. Можаце сабе ўявіць, у якім псіхалагічным стане можа быць жанчына, з вуснаў якой здольныя сарвацца самыя жорсткія словы!

Аборт, як я сказала, — гэта вынік. Дарэчы, мы любім змагацца з вынікамі. Гэта як з п'янствам. Мы з неапраўданым энтузіязмам гаворым пра кадзіраванне, лячэнне, вывядзенне з запою... Пазбаўляем гэтых «алкашоў» бацькоўскіх правоў і выхоўваем у дзіцячых дамах іх дзяцей... Забараняем піць на працоўных і ў грамадскіх месцах... Бязлітасная, але, па большай часці, дарэмная барацьба... А што рэальна зроблена для таго, каб не даць чалавеку «тупа збухацца»? Як і калі пачынаецца гэтае самае п'янства — вось пытанне, над якім сапраўды варта біцца. У які момант мы, дарослыя, упускаем з віду, што дзеці — нашы ці чужыя — пачынаюць злоўжываць?

Нашы дзеці на самай справе не ведаюць праўды пра алкаголь. Дый адкуль ім ведаць? Яны проста глядзяць на свет шырока расплюшчанымі вачыма і бачаць, як іх бацькі не прапускаюць ні святы, ні памінкі, якія адзначаюцца з апантаным размахам — каб не горш, чым у суседзяў... Нашых настаўнікаў хвалююць не праблемы асобна ўзятага вучня, а шэраг прадпісанняў з усіх бакоў, а школьных псіхолагаў — наогул Бог яго ведае, што іх хвалюе... Ведаю школьных псіхолагаў, якія працуюць у адных школах, а дзяцей сваіх «прыстроілі» ў іншыя. Чаму? Па той толькі прычыне, што атмасфера, стасункі паміж вучнямі, паміж вучнямі і настаўнікамі па месцы іх працы — дрэнныя! Сваіх дзяцей, бач ты, шкадуюць... А чаму б вам, спадарыні, не паспрабаваць палепшыць гэтую самую атмасферу ў асобна ўзятай школе?..

Так і з абортамі. Нашы дзеці на самай справе не ведаюць праўды пра аборты. Яны заканчваюць школы і ўніверсітэты, але ПРАЎДЫ пра абстыненты сіндром, выспяванне яйцаклеткі, наступствы аборту і каварства хламідыі яны не ведаюць!

Дарэчы, няправільна было б дзяўчынкам даваць веды пра жаночы арганізм, а мужчынам — пра мужчынскі. Сапраўдны мужык павінен ведаць, для чаго жанчыне патрэбны матачныя трубы! Упэўнена: чым больш моцны пол будзе ведаць такіх «тонкасцяў», тым складаней яго прадстаўнікам будзе нават дапусціць думку: «ну, што ж... зрабі аборт». Нельга гаварыць аб праблеме аборту выключна як пра жаночую...

Мы, дарослыя, так апантана крывім душой, так многа і не да месца гаворым пра разумнае, добрае, вечнае, што ўжо ванітуе ад «дэмаграфіі» і «шчаслівага мацярынства». Што да гэтага маладой дзяўчыне ці хлопцу, якія незалежна ад ступені маральнасці, адзнак у дзённіку і іншых «дробязяў» хочуць і могуць займацца сэксам? Ім глыбока пляваць на дзяржаўныя прыярытэты, на дэмаграфію і шчаслівае мацярынства разам узятыя. Ніхто з маіх сябровак (паверце, самых лепшых сябровак і жанчын у свеце) у свой час развітання з цнатлівасцю не думаў пра дэмаграфічную бяспеку краіны і амаральнасць такога кроку як аборт.

Хіба той, хто чытае зараз гэтыя радкі, быў іншым? Хіба шэраг цудоўных жанчын — колішніх выдатніц і камсамолак — хацелі стаць «забойцамі новага жыцця»? Аборт — гэта ні дрэнна, ні добра. Гэта заўсёды канкрэтны факт, прычым характэрны для жыцця не толькі неразумных падлеткаў.

Не зразумела іншае: чаму тыя, хто так «трасецца» над кожным забітым жыццём, гэтак жа горача не выступаюць за папярэджанне падобных учынкаў — перадачу жыццёва неабходных новаму пакаленню ведаў? Не пра аборты трэба гаварыць у XXI стагоддзі, а пра нашу нізкую сэксуальную адукаванасць, недасведчанасць, цемрашальства, ляноту і злачыннае з пункту гледжання здароўя выхаванне. Колькі гадоў як наша грамадства стала адкрытым для абмеркавання сэксуальнай тэматыкі, колькі літаратуры выдадзена, колькі разумных людзей выступае ў тых жа СМІ, а ўсё яшчэ не пераводзяцца мужчыны, якія бравіруюць тым, што «спяць» без прэзерватыву! Ды якое права мужчына наогул мае дакрануцца да жанчыны, пакуль не папытаецца ў партнёршы пра яе бяспеку!? Я ўжо не кажу, што і сам ён рызыкуе падхапіць што-небудзь непрыстойнае і не заўсёды, як вядома, вылечнае.

А жанчыны? Адна справа — аднаразовыя зацемкі розуму, не дай Бог, згвалтаванне, якія завяршыліся непажаданай цяжарнасцю, а значыць, іншага, акрамя перарывання цяжарнасці, выйсця проста няма. Але мяркуючы па колькасці абортаў, якія выконваюцца ў краіне, жанчыны зноў і зноў дазваляюць сваім партнёркі «качаўражыцца» і адмаўляцца ад прэзерватыву.

Я ўжо не буду падрабязна разглядаць усе іншыя спосабы засцярогі ад той жа цяжарнасці... Дарагія суайчыннікі! Калі сярод вас ёсць такія, хто дагэтуль не ведае пра ўсе спосабы засцярогі ад незапланаванай цяжарнасці і інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам, дык папытайцеся пра гэта ў гінеколага, уролага, андролага... Сэксуальнай рэформы ў навучальных установах можна ж і не дачакацца.

Шчыра жадаю ўсім людзям мець столькі дзяцей, колькі здольныя зрабіць іх шчаслівымі і колькіх здольныя зрабіць шчаслівымі яны. Не азірайцеся на статыстычныя паказчыкі! Бярыце на сябе столькі, колькі можаце несці. І тады ўсім будзе добра.

З павагай MADONNA, *г. Мінск.*

У ФІНЛЯНДЫІ ЗАБАРАНІЛІ ПАКАЗВАЦЬ ЦЫГАРЭТЫ ПАКУПНІКАМ

Фінскія ўлады зрабілі больш жорсткімі законы, накіраваныя на барацьбу з курэннем. З гэтага часу тытунёвую прадукцыю забароняць выстаўляць на вітрынах крамаў краіны, паведамляе АВС.

Згодна з новым законам, уладальнікаў крамаў абавяжуць да вясны прыбраць усе вітрыны з тытунёвымі вырабамі. Курцам пры набыцці цыгарэт давядзецца пытацца аб іх у прадаўцоў, якія будуць даставаць жаданае з-пад прылаўка.

Закон таксама забароніць курыць у машыне, калі ў ёй знаходзіцца няпоўнагадовы. Акрамя таго, на працягу найбліжэйшых трох гадоў у Фінляндыі плануецца дэмантаваць усе аўтаматы па продажы цыгарэт.

Такая заканадаўчая ініцыятыва зробленая ў рамках праграмы па поўным выкараненні курэння — паводле слоў дзяржаўнага сакратара Ілкі Аксалы, Фінляндыя паставіла мэту стаць першай краінай, якая пазбавілася ад гэтай шкоднай звычкі «раз і назаўсёды». Улады разлічваюць дасягнуць гэтага ў найбліжэйшыя 30 гадоў.

Як сказана ў паведамленні, гігант тытунёвай індустрыі Philip Morris пачаў вывучэнне юрыдычных магчымасцяў выхаду з сітуацыі.

Адусюль

У КІТАІ НАРАДЗІЛА ДЗЕВЯЦІГАДОВАЯ ДЗЯЎЧЫНКА

Дзевяцігадовая жыхарка кітайскай правінцыі Гірын нарадзіла цалкам здаровае дзіця. Медыкі вырашылі не рызыкаваць здароўем малалетняй матулі і прынялі роды шляхам правядзення кесарава сячэння.

Як стала вядома, незвычайнае немаўля з'явілася на свет у бальніцы горада Чанчунь. Яго вага складае 2750 грамаў, і, паводле слоў дактароў, стан і маці, і нованароджанага ацэньваецца як «добры», перадаюць «Дні. ру».

Урачы таксама канстатавалі, што дзевяцігадовая парадзіха выглядае значна старэй за свой узрост. Што датычыцца бацькі дзіцяці, то яго вышукам занялася мясцовая паліцыя, бо, згодна з кітайскім заканадаўствам, уступленне ў сувязь з дзяўчатамі, маладзейшымі за 14 гадоў, прыраўноўваецца да згвалтавання.

Паводле інфармацыі сайта газеты «Московский комсомолец», прыкладна 30 % усіх праводзімых у Кітаі абортаў прыпадае на долю школьніц. Калі ж улічыць таксама студэнтак каледжаў і навучэнак прафесійна-тэхнічных вучылішчаў, то гэта лічба дасягне 50 %.

Нетрадыцыйная медыцына

Многія хваробы пакідаюць свой след на твары

Фізіягномікай, або навукай аб твары, вучоныя займаліся здавён. У свой час М.І. Пірагоў нават склаў атлас «Твар хворага». Ён сцвярджаў, што практычна кожнае захворванне пакідае свой характэрны след на твары чалавека. Аднак асабліва распаўсюджванне метад дыягностыкі па твары атрымаў у краінах Усходу. Пры ім звяртаецца ўвага на стан вачэй: колер склеры, бялкоў, радужнай абалонкі.

— А яшчэ, — адзначае **прафесар загадчык кафедры рэфлексатэрапіі БелМАПА Аляксандр СІВАКОЎ**, — усходнія медыкі вялікую ўвагу надаюць агляду языка, яго памерам, колеру цела языка, колеру налётаў на ім і г. д.

Па рысах твару можна, напрыклад, прадказаць інфаркт міякарда. **Самая надзейная дыягнастычная адзнака магчымай сардэчнай «катастрофы» — парушэнне адчувальнасці ажно да анямення скурнай зоны паміж падбародкам і ніжняй губой. Калі з гэтай зоны ўзняцца вышэй, то наяўнасць глыбокай маршчыны паміж губой і носам сведчыць аб дэфекце сардэчнага клапана. Сардэчная недастатковасць, якая пачынаецца, праяўляецца на твары перыядычным пасіненнем вуснаў.** Калі вы заўважылі за сабой падобнае, гэта сур'ёзная прычына для візіту да доктара.

Важная прыкмета павышанай нагрузкі на сэрца і органы кровазвароту — глыбокая і падоўжаная насагубная складка з абодвух бакоў. Аб неўрозе сэрца сведчыць вузкая спінка носа.

Чырвоны бугрысты нос з пражылкамі крывяносных сасудаў сведчыць аб высокім узроўні артэрыяльнага ціску. Нізкі ж артэрыяльны ціск часта праяўляецца сіне-чырвонай афарбоўкай носа. Аб сардэчных захворваннях нагадваюць крылы носа, што маюць сіне-чырвоную афарбоўку, а аб парушэннях кровазвароту — бледнасць вушных ракавін з характэрным васковым адценнем.

Важная дыягнастычная зона — скроні. **Выгнутая скроневая артэрыя з рэзкім контурам, якая выступае пад скурай у спалучэнні з перыядычным пачырваненнем твару паказвае на частае і рэзкае павышэнне артэрыяльнага ціску. У такіх людзей высокая верагоднасць гіпертанічнага крызу.**

Адной з прыкмет сардэчных праблем могуць служыць шчокі. **Пры запаласці левай шчакі можна западозрыць сардэчнае захворванне. Ускоснай прыкметай ранняга парушэння кровазвароту ў маладым узросце з'яўляецца заўчасная пасівеласць валасоў.**

На схільнасць да хваробаў сэрца паказвае кароткая шыя. Акрамя праблем з сэрцам, для ўладальніка кароткай шыі цалкам верагодная пагроза ранняга склерозу сасудаў галаўнога мозга.

Аб сур'ёзных праблемах са здароўем могуць сведчыць і шматлікія так званыя «касметычныя» недахопы на твары.

Напрыклад, **мяшкі пад вачыма, а таксама ацёчнасць твару ў цэлым сведчаць аб магчымых праблемах з ныркамі ці са шчытападобнай залозай.**

Аб цэлым комплексе захворванняў могуць расказаць цёмныя кругі пад вачыма, што раптоўна з'явіліся і доўга не праходзяць.

Самыя банальныя прышчы — гэта ўвогуле сапраўдная «карта» хваробаў, размешчаная на нашым твары. У залежнасці ад іх месцазнаходжання можна дыягнаставаць як захворванні палавой сістэмы, так і праблемы са страўнікава-кішачным трактам, нервовай і эндакрыннай сістэмамі, а таксама мноства іншых парушэнняў. Спрактыкаваны ўрач можа ацаніць здароўе пацыента нават па стане яго скуры: яе адценні, ступені сухасці і г.д.

Але ўсё ж па твары больш за ўсё можна «вылічыць» захворванняў цэнтральнай нервовай сістэмы. Амерыканскія даследчыкі распрацавалі для гэтага спецыяльную праграму, здольную распазнаваць захворванні і генетычныя сіндромы. Камп'ютар, аналізуючы рысы твару пацыента, дапамагае ўрачам з малым вопытам работы ставіць дыягназ. Выкарыстоўваючы фотаздымкі хворых, камп'ютар навучылі распазнаваць надзвычай рэдкія паталогіі.

Першыя спробы далі правільны дыягназ у 60 % выпадкаў. Вельмі важна, што новая праграма дазваляе ставіць папярэдні дыягназ задоўга да з'яўлення іншых клінічных праяў захворвання.

ВОЛЬГА ШАЎКО.

Расціслаў ЯНКОЎСКІ: «У НАС У СЯМ'І НІКОЛІ НЕ АДРАКАЛІСЯ»

НАПЯРЭДАДНІ 80-годдзя ў народнага артыста СССР Расціслава Янкоўскага шмат клопатаў. На юбілей збяруцца яго родныя — брат Мікалай, які жыве ў Расіі, сыны Ігар і Уладзімір, чакаюць і Філіпа Янкоўскага, сына Алега. Гэта сапраўды сям'я — яны ўвесь час адзін аднаго падтрымліваюць, падзяляюць і перажыванні, і радасці.

Ёсць у Расціслава Янкоўскага і яшчэ адна сям'я — тэатральная. У Нацыянальным драматычным акадэмічным тэатры склалася яго творчая кар'ера. А напярэдадні юбілею працы стала болей: ён рэпеціруе новую ролю — легендарнага Пане Каханку, рэальнага чалавека з беларускай гісторыі, якога артыст называе беларускім баронам Мюнхаўзенам. Роля, якую нельга не сыграць, будучы Янкоўскім...

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Вы зараз рэпеціруеце ролю Радзівіла Пане Каханку, асобы, якая ў беларускай гісторыі лічыцца вельмі неардынарнай. Калі вы ўзяліся за гэтую ролю, то можаце сказаць, чым вам цікавы гэты персанаж?

— Аўтар Андрэй Курэйчык сказаў, што напісаў п'есу для Янкоўскага. Я быў вельмі здзіўлены. Бо гэта накладае пэўныя абавязкі. Але я веру ў нашага маладога галоўнага рэжысёра. І іграць ёсць што: Пане Каханку цікавая асоба. Кажуць, ён у нечым як Мюнхгаўзен. Так, ён па натуры быў неўтаймоўны, з багатай фантазіяй, мог прыхлусіць і галоўнае — сам у гэта верыў. Але ў ім была пэўная цэльнасць. Ён — збіральнік людзей Беларусі, ліцьвінаў. Быў магутным уладаром Вялікага Княства Літоўскага, між іншым, быў Віленскім ваяводам, у яго былі войскі.

— Забавы яму больш падабаліся.

— І забавы, і балі, любіў розныя розыгрышы. Магчыма, каб прыцягнуць да сябе ўвагу членаў сейма. Тады дэмакратыя была ў Польшчы: не ставіўся чалавек каралём, а выбіраўся. І ён мог бы ім стаць. Але Расія вяла сваю гульню, войскі стаялі побач, Кацярына паставіла Панятоўскага, прыгажуна, франта. Пане Каханку некалькі разоў з войскам хадзіў, пратэставаў, бо, магчыма, на нешта спадзяваўся. У ім яшчэ было такое, што ён свайму народу, сваім падданым імкнуўся стварыць нядрэннае жыццё: гандаль ішоў цудоўна. Мы ездзілі ў Нясвіж, шмат даведаліся пра чалавека, які цяпер успрымаецца больш як мясцовы дзівак. Што гэта: дарогу соллю па яго загадзе пасыпалі, каб гасцям зіму стварыць? Ці птушак пасадзіць у торт, каб яны выпырхнулі, а кроплі крэму на дам паляцелі. Вельмі смешна!..

Ён любіў тэатр, мастакоў. У нашым музеі ёсць яго партрэт — не вельмі ўдалы. Я ніяк не мог зразумець, чаму. Аказалася, пісалі яго мясцовыя мастакі. Дарэчы, знакаміты Бірон (я быў у яго ў замку пад Рыгай) таксама звяртаўся да паслуг мясцовых мастакоў, хоць ёсць у яго партрэты, напісаныя італьянскімі, французскімі майстрамі. У нашай п'есе гучыць пытанне Панятоўскага: «Ты не мог выклікаць лепшых майстроў?» Адказ такі: «Запрасіць любы можа, а ці можаш ты свайго мастака знайсці?»

У яго была лабараторыя, дзе ён даследаванні рабіў, прыдумляў нешта. Безумоўна, наш спектакль — мастацкі твор, у ім ёсць доля фэнтэзі: нібыта ён хацеў навучыць беларусаў лятаць, крылы рабіў. Не ведаю, наколькі гэта блізка да рэальнасці. Але на нашу глебу кладзецца. Напрыклад, сястра Тэафілія кажа: «Ды ні за што яны не паляцяць, адарвацца ад зямлі не могуць». — «Тады будуць шкадаваць, што не паляцелі. Трэба, каб яны бачылі, што ў іх пад носам, каб яны бачылі зямлю, якая яна цудоўная».

— Пэўна, што ён быў не проста экзальтаваным панам, але жыццялюбам. Вы можаце сябе назваць такім?

— У Еўтушэнкі ёсць добры верш: калі паміраць на гэтым свеце, то ад шчасця. Я згодны — жыццё — гэта цікавая з'ява. У жыцці чалавека столькі цікавага, прыемнага, добрага. Я магу сказаць, што люблю жыццё — тое, якое мне Гасподзь падарыў. Я яму ўдзячны, што ён мне падарыў каханую жонку, з якой я разам 60 гадоў і якая мне падарыла дзяцей. Сыну Ігару на наступны год будзе 60, а малодшаму Валодзю — 50 сёлета. Ён мне падарыў унукаў — Дзяніса, Ану-Марыю, Івана, якому 1 лютага споўнілася 3 гады. Гасподзь падарыў мне любімую працу.

— Здаецца, што ваша галоўная якасць — адданасць некаму ці нечаму — таксама Божы дар?

— Калі я рос, то нельга было адкрыта праяўляць свае рэлігійныя пачуцці. Але ў нашай сям'і ніколі не адракаліся ні ад каго і ні ад чаго. І ні ад малітвы. Мы з бабуляй маліліся. Тады праваслаўныя цэрквы пазачыняліся, я памятаю, як вырывалі крыж з сабора — жудасць, быццам нешта жывое выламалі. Бабуля мне аднойчы кажа: давай пойдзем у царкву твайго бацькі, бо Бог адзін. Мы пайшлі ў касцёл. На мяне касцёл зрабіў шокавае ўражанне: купель, акуратныя парты, арган. Урачыстая прыгажосць, пах ладану... Калі я прыйшоў дамоў, дастаў сваю цацку — ваўчок. Прывязаў вяроўку да яго і гуляў, хадзіў, быццам ксёндз, звінеў кадзілам. Суседка пыталася: «Ці гэта ў вас святар быў?» Бабуля казала: «Ды не, гэта Росцік гуляе...» З намі побач яўрэйская сям'я жыла — вельмі добрыя людзі, заўсёды нам дапамагалі: як яўрэйская Пасха — яны нам мацу, а мы на свой Вялікдзень нічога не маглі спячы...

— Вы раслі ў той час, калі шмат хто вымушаны быў адракацца ад родных, каб выжыць. Але шляхецкае прозвішча бацькі ў вашай сям'і захавалася.

— Калі бацька сядзеў у лагерах у Пячорах (тады яшчэ не шмат давалі — 5 гадоў, ужо потым разыграліся...), то ён пісаў маці: магчыма, ты памяняеш прозвішча, і ўсё падобнае... Мы жылі тады ў Адэсе, былі сям'ёй ворага народа, нам пагражала высяленне. Тады сталіцай Украіны быў Харкаў. Мама паехала да Постышава. Мне запомнілася яго прозвішча яшчэ і таму, што навагоднія ёлкі ён дазволіў, хоць гэта ўжо было не тое свята. Ён дазволіў нам застацца ў Адэсе. Жылі тады цяжка. Але ніхто не адрокся: ні мама, ні бабуля. Галоўныя якасці чалавека закладваюцца ў бацькоўскай сям'і. Бацька быў прыгожы чалавек, мама — прыгожая жанчына, бабуля. У нас у сям'і гучала французская мова. Бацька — чалавек надзвычай высокай культуры: праз кнігі, якія ён чытаў услых, я атрымаў любоў да літаратуры. І любоў да творчасці нарадзілася, магчыма, дзякуючы бацькам.

— Вы і сваю сям'ю стварылі моцнай.

— Шчаслівы чалавек, у якога складваецца выбар сям'і і прафесіі. Калі прыходзіш дадому і адчуваеш радасць ад таго, што ўсё так добра і цябе сустракае каханы чалавек, які падстаўляе плячо ў цяжкі момант. Напэўна, гэта шчасце, што ў мяне ёсць сыны і ўнукі. Ты шчаслівы, калі бачыш тварык малога — заўсёды размаўляю з партрэтам малодшага ўнука (стаіць на століку ў грымёрцы. — **Аўт.**), яму тут год. Кажу: «Іван, думаеш, лёгка дзеду твайму? Шчаслівы, калі глядзіш на жанчыну, якая корміць немаўля — я заўсёды з замілаваннем гляджу, як малы задаволена чмокае.

— Як захаваць каханне на ўсё жыццё?

— А што яго захоўваць, калі яно ёсць? Іншая рэч, што разбурыць можа любы. Трэба, каб у жонкі былі мазгі. І яна хацела б, каб табе было добра, а я хацеў бы, каб было добра ёй. Так проста і так цяжка. Цяпер кажуць, каб матэрыяльна было ўсё добра, тады не было б разводаў. Ды як мы пачыналі будаваць сям'ю — не дай Бог! У нас з Нінай есці не было чаго. Яна нарадзіла дзіця, мы здымалі нейкую хібару. У двары рос абрыкос. І яна падбірала плады — зварыць кампот, а гаспадыні кажа: «Была на базары...» Бо няёмка. З хлебам паядзім — 5 рублёў эканоміі. А мы яшчэ і ў кіно ідзём. Кінатэатр далёка — на загрыўкі пасаджу малога Ігарошку, паглядзім кіно, і па шпалах ідзём дадому. Яшчэ і спяваю я нешта... І кахалі адно аднаго, і было жаданне! Трэба кахаць, хацець гэтага чалавека. Кажуць: першы год-два пачуццё буяе, а потым усё прыядаецца. Магчыма і так — толькі трэба падтрымліваць пачуццё. Але ў мяне надоўга працягнуліся да яе адносіны мужчынскага жадання. Яна «ачаравашка» ў мяне.

— Вас разам можна бачыць на свецкіх мерапрыемствах.

— Так. Але гэта не значыць, што яна не можа цыкнуць на мяне, ці я не магу ўзарвацца. Гэта натуральна, бывае ў жыцці. Але я хутка адыходжу. Яна разумее, яна ўмее зняць гэта.

— Вы ўсё жыццё дэманструеце адданасць жанчыне, абранай працы. А таксама і краіне, адкуль паходзіць ваш род і дзе прайшлі вашы сталыя гады. Але ж была спакуса з'ехаць. Чаму вы не скарысталі гэтыя магчымасці?

— Вядома ж, хацелася... пакарыць Маскву, Піцер. Тым больш, калі рэжысёр Уладзіміраў сюды прыязджаў, то запрашаў мяне. Ён і Алега запрашаў. Але Алег стаў працаваць з Маркам Захаравым. Уладзіміраў казаў тады: «Прозвішча Янкоўскі я чуць не магу». Гэта мне потым Фрэйндліх расказвала. Я і ў Кіеў мог з'ехаць. У Маскву — мог бы, у «Малым» тэатры працаваць. Вельмі хацела Быстрыцкая, каб я з ёй іграў спектакль. Але я не з'ехаў.

Быў перыяд, калі я атрымліваў невысокі заробак. А ў Кіеве больш прапаноўвалі. Абяцалі кватэру ў новым доме, там, дзе будуць жыць Тарапунька і Штэпсель. Я ўзяў і напісаў заяву. Тут мяне запрасілі ў міністэрства: «Што вас не задавальняе?» Я здзівіўся, што яны ведаюць пра маё запрашэнне. Была малапрыемная размова. Але ва ўсялякім разе заробак мне павысілі. І кватэру далі прыстойную. Уладзіміраў прыехаў: «Такую кватэру ў Піцеры даць не магу...» Усё адыгрывае ролю: я ж жывы чалавек, у мяне сям'я. Стаўленне да мяне, ролі, якія я іграў, таксама значылі шмат. Таму не магу біць сябе ў грудзі і казаць: я такі патрыёт!... Несумненна, я люблю Беларусь, яна дала мне ў жыцці шмат добрага. І гэта радзіма майго бацькі.

— Гэта адыгрывала ролю, калі вы сюды пераязджалі з маладой сям'ёй — практычна на пустое месца?

— Безумоўна. Вось мы зараз сядзім у грымёрцы — дык мы сям'ёй у ёй жылі! А потым яшчэ і другую далі, калі Клімава атрымала кватэру, потым галоўны мастак атрымаў кватэру. Матэрыяльныя выгоды якія ў нашай прафесіі? Заробак заўсёды быў невысокі. Здымаўся я не так часта, як Алежка. Алежка — неверагоднага таленту чалавек.

— Вам жа пашчасціла іграць разам у некаторых фільмах..

— Так, у «Францыску Скарыне» іграў брата. Разам здымаліся ў «Служылі два таварышы». Я не думаў пра тое, што здымаюся з братам, бо калі працую, забываю пра такія рэчы. Проста маім партнёрам на той момант быў артыст Алег Янкоўскі. Што тут казаць: Алежка — вялікі артыст кіно і тэатра. У нас цяпер няма акцёраў такога ўзроўню. З ім сышло вельмі шмат. Калі глядзець па ўнутранай вытанчанасці, па інтэлігентнасці, па харызме...

Мы ніколі не давалі ніякіх настаўленняў адзін аднаму. Алег ведаў, кім я з'яўляюся ў тэатры. Я памятаю, быў на гастролях у Саратаве, а ігралі мы «Двое на арэлях» з Клімавай (цудоўны спектакль, які адразу не пусцілі, а зрабілі для абкамаўскіх супрацоўнікаў закрыты прагляд). Гэтую п'есу ігралі ўсяго ў двух тэатрах — у «Современнике» і ў нас. Педагог Алега паглядзеў і потым яму сказаў: «Будзеш іграць як брат, усё будзе ў парадку». Стаў іграць і як брат, і лепш, чым брат. А ў кіно працаваў — проста бліскуча. У тэатры ў нас у кожнага свая дарога.

— У нас няшмат асобаў, якія атрымалі званне народнага артыста СССР...

— І Алег атрымаў. Ён апошні народны, паводле апошняга ўказа апошняга прэзідэнта СССР. «Аднаўказнік» з Алай Пугачовай. Яны атрымалі — і разваліўся Савецкі Саюз.

— Аднак вы атрымалі значна раней за брата, калі Саюз існаваў і калі для такіх рашэнняў патрабаваліся сур'ёзныя падставы.

— Так, усё вырашалася праз міністэрства: разглядаліся твае ролі, гастролі, унёсак. Рэкамендацыя падавалася наверх. Але вырашала толькі Масква. Нас цяпер засталося няшмат, мы як выкапні. Але ўсё адно мы любім і паважаем гэтае званне, таму што ведаем: у вялікай краіне, якое б ні было да яе стаўленне, існавала вялікае добрае мастацтва.

— Вы падтрымліваеце адносіны са сваімі ўганараванымі калегамі?

— Было цудоўна, калі існаваў «Дом акцёраў» у Маскве. Цудоўную атмасферу ў ім стварыла Маргарыта Эскіна, вялікая жанчына, царства ёй нябеснае. Збіраліся амаль усе народныя Савецкага Саюза — з Літвы, Латвіі, Украіны, масквічы. Масквічы паказвалі капуснік — і які! «Піцерцы» прыязджаюць — у іх свой капуснік. Цудоўныя былі канцэрты, мы бралі ўдзел у іх. Безумоўна, былі і сустрэчы, і банкеты. Кожны год мы прыязджалі туды. Калі Эскіна памерла, Этуш узяў усё ў свае рукі. Але цяпер не так. Бо была сапраўдная гаспадыня ўтульнага дома. Яна прыязджала аднойчы на мой юбілей. Цэлая група тады прыехала. Мы ўсе яе ўспамінаем з цеплынёй — Баніёніс, Адамайціс, Будрайціс, грузінскія акцёры. Я ад Беларусі. Мне пашчасціла, што мяне адзначылі, што я меў гонар быць знаёмы з гэтымі артыстамі. Мы дагэтуль сябруем.

— Цяпер яны часам прыязджаюць на «Лістапад», дзе вы старшыня. З-за павагі да вас?

— Яны прыязджаюць на добры фестываль, дзе 52 краіны, дзе добрыя карціны высокага ўзроўню. Дарэчы, старшыня журы Чухрай, сказаў, што ўзровень карцін вышэйшы, чым на Маскоўскім фестывалі. Зразумела, калі мы бяром фільмы, узнагароджаныя ў Канах, ці ў Берліне, ці ў Венецыі. Гэта фестываль фестываляў. Мы так задумалі з Валянцінай Сцяпанавай 16 гадоў таму. Мы хочам, каб мінчане бачылі лепшыя фільмы еўрапейскага кіно. Пакуль нам гэта ўдавалася.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Кіназала

У ЛІКУ НАМІНАНТАЎ НА «ОСКАР» — ФІЛЬМ З УДЗЕЛАМ БЕЛАРУСАЎ

КАРОТКАМЕТРАЖКА ірландскага рэжысёра Хуаніты Уілсан «Дзверы» (The Door) названая сярод прэтэндэнтаў на прэмію «Оскар» у катэгорыі «Лепшы гульнявы кароткаметражны фільм». У аснову гэтай стужкі лягла адна з гісторый, расказаных у кнізе Святланы Алексіевіч «Чарнобыльская малітва» — аб тым, як бацькі страчваюць маленькую дачку ў выніку чарнобыльскай трагедыі.

Фота з афіцыйнага сайта фільма «Дзверы» www.thedoorshortfilm.com.

Здымаць фільм таксама планавалі ў Беларусі, дзе адбылася папярэдняя падрыхтоўка і падбор акцёраў — у фільме занятыя, напрыклад, акцёр Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Ігар Сігаў і былая мінчанка, а цяпер актрыса маскоўскага тэатра «Школа сучаснай п'есы» Джульета Казакевіч-Герынг. Але потым мінскі прадзюсар Ілья Кузняцоў паказаў рэжысёру і аператару здымкі, якія ён рабіў у Прыпяці — маленькім украінскім гарадку, што адным з першых пасля аварыі на ЧАЭС трапіў у зону адсялення. У выніку другую частку акцёраў данабралі ў Кіеве, а здымкі дзеля большай рэалістычнасці адбываліся менавіта ў Прыпяці.

«Дзверы — універсальны сімвал жыцця, смерці, уваходу ў наступнае жыццё, — разважаюць над загалоўным сімвалам стваральнікі на афіцыйным сайце карціны http://www.thedoorshortfilm.com. — Яны могуць абазначаць рэалізаваную магчымасць або згубленую, бо адны дзверы расчыняюцца, а другія зачыняюцца. Праз успрыманне аднаго чалавека гледачы становяцца сведкамі агульнай вялікай бяды — чарнобыльскай трагедыі...». Гэта пранізлівая гісторыя ўжо атрымала шэраг міжнародных узнагарод, а цяпер трапіла і ў поле зроку амерыканскіх кінаакадэмікаў. Канкурэнцыю ў намінацыі «Лепшы гульнявы кароткаметражны фільм» ёй складуць стужкі «Замест Абракадабры» (Патрык Эклунд і Магнус Ф'ельстром), «Каві» (Грэг Хелві), «Чароўная рыба» (Люк Дулан і Дру Бэйлі), а таксама «Новыя жыхары» (Іахім Бэк і Ціві Магнусан). Урачыстая цырымонія ўручэння прэміі «Оскар» за 2009 год адбудзецца сёлета 7 сакавіка ў Лос-Анджэлесе. Зрэшты, незалежна ад вынікаў цырымоніі, рэжысёр «Дзвярэй» Хуаніта Уілсан мае намер неўзабаве яшчэ раз прыехаць у Мінск.

На здымку: Ігар СІГАЎ (Мікалай) і Ліля ГРЭЧЫК (Лена).

Вікторыя ЗАХАРАВА.

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ЖИЛЫХ ДОМОВ

<table>
<tr><td>Дата, время, место проведения аукциона</td><td colspan="5">09 марта 2010 года в 10.00 в здании райисполкома (г. Поставы, пл. Ленина, 25, III этаж, каб. 58)</td></tr>
<tr><td rowspan="3">Адреса, площади, кадастровые номера земельных участков, начальная цена</td><td>№№ лота</td><td>Адреса участков</td><td>Площадь, га</td><td>Кадастровый номер</td><td>Начальная цена, рублей</td></tr>
<tr><td>1.</td><td>Куропольский сельсовет д. Черты, ул. Лесная, д. 23</td><td>0,1343</td><td>224082709101000124</td><td>6 000 000</td></tr>
<tr><td>2.</td><td>Куропольский сельсовет д. Черты, ул. Озерная, д. 40 А</td><td>0,2496</td><td>224082709101000125</td><td>3 000 000</td></tr>
<tr><td>Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельных участков для проведения аукциона</td><td colspan="5">- внесение победителем аукциона в местный бюджет платы за право частной собственности на земельный участок в размере, заявленном на торгах;
- возмещение соответствующему исполкому расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельных участков, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельных участков;
- государственная регистрация права на земельный участок в двухмесячный срок со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка;
- получение победителем аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома;
- занятие (освоение) земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации</td></tr>
<tr><td>Порядок осмотра на местности земельных участков, которые предполагается передать в аренду по результатам аукциона</td><td colspan="5">В рабочие дни с 8.00 до 17.00 по мере обращений лиц, заинтересованных в участии в аукционе. Обращаться в землеустроительную и геодезическую службу Поставского района г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. 11</td></tr>
<tr><td>Перечень документов, которые необходимо предоставить участникам аукциона до его начала</td><td colspan="5">- заявление на участие в аукционе (бланк можно получить и заполнить непосредственно в землеустроительной службе);
- квитанция об уплате задатка;
- ксерокопия стр. 25, 31, 32, 33 общегражданского паспорта без нотариального засвидетельствования</td></tr>
<tr><td>Место, дата и время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов</td><td colspan="5">г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. 11 в рабочие дни с 8.00 до 17.00, по субботам с 9.00 до 14.00 с 05 февраля по 05 марта 2010 года включительно</td></tr>
<tr><td rowspan="2">Сумма подлежащих возмещению организатору аукциона расходов на его проведение (уплачивается победителем по соответствующему лоту помимо суммы, заявленной на торгах)</td><td colspan="2">лот № 1</td><td colspan="3">477 737 + 84 000</td></tr>
<tr><td colspan="2">лот № 2</td><td colspan="3">498 630 + 84 000</td></tr>
<tr><td>Размер задатка, срок и порядок его внесения</td><td colspan="5">10 % от начальной цены соответствующего участка до подачи заявления на счет соответствующего исполкома. Реквизиты платежа указаны в бланке заявления на участие в аукционе</td></tr>
<tr><td>Адрес и номер контактного телефона комиссии</td><td colspan="5">г. Поставы, пл. Ленина, 25, здание райисполкома, 1-й этаж, каб. № 11 в рабочие дни с 8.00 до 17.00 (перерыв на обед с 13.00 до 14.00), телефоны 8(02155) 43180, 41132</td></tr>
</table>

Па чутках і аўтарытэтна

АНТЫЗЯМЛЯ: тэорыі і факты



ЕГІПЕТ, Даліна цароў, пахаванне Рамсеса VI, 20-я дынастыя Новага царства. Верхні ўзровень J, правая сцяна, у цэнтры выява — чалавечая фігура жоўтага колеру, якая сімвалізуе Сонца. Праз фігуру праходзіць выгнутая крывая. Гэта арбіта, якая перасякае цела якраз на ўзроўні трэцяй чакры (у вобласці сонечнага спляцення) і гэтым паказвае на свой парадкавы нумар (нагадаем, Зямля — трэцяя планета ад Сонца). Вось толькі на арбіце намаляваны ДЗВЕ планеты: адна — перад сімвалічнай фігурай, другая — ззаду, дыяметральна насупраць.

Такой версіі расшыфроўкі сімвалічных малюнкаў на сценах пахаванняў Даліны цароў прытрымліваюцца прыхільнікі тэорыі існавання ў нашай блакітнай планеты суседа па арбіце. Яны перакананыя, што такім чынам старажытныя егіпцяне імкнуліся захаваць інфармацыю аб Антызямлі ці Глорыі, як яшчэ называюць «планету за Сонцам». Цікава, што падобныя звесткі захаваліся і ў вучэнні неапіфагарэйца Філалая, які сцвярджаў, што на арбіце Зямлі, за Сонцам, якое ён называў Хестна (цэнтральны агонь), знаходзіцца падобнае на Зямлю цела — Антызямля.

У сусветным павуцінні ёсць мора інфармацыі аб Антызямлі і спасылак на вядомых і не вельмі вучоных, якія ў розны час быццам бы на свае вочы бачылі Глорыю ў тэлескопы. Напрыклад, узгадваецца дырэктар Парыжскай абсерваторыі Джавані Дамініка Касіні, які ранкам 25 студзеня 1672 года ўбачыў паблізу Венеры невядомае серпападобнае цела, з ценем, які прама паказваў на тое, што цела было буйной планетай, а не зоркай. Серпападобнай на той момант была і Венера, таму Касіні спачатку меркаваў, што выявіў яе спадарожнік. Памеры цела былі вялікімі — Касіні ацаніў іх у чвэрць дыяметра Венеры. Праз 14 гадоў Касіні быццам бы зноў убачыў гэтую планету.

23 кастрычніка 1740 года, перад світаннем, нейкую загадкавую планету заўважыў член Каралеўскага навуковага таварыства астраном Джэймс Шорт. У розны час яе быццам бы бачылі і іншыя астраномы. Самае позняе назіранне, зробленае 13 жніўня 1892 года, прыпісваецца амерыканскаму астраному Эдуарду Эмерсану Барнарду, які заўважыў паблізу Венеры невядомы аб'ект сёмай зорнай велічыні. Паводле розных ацэнак, памер планеты вагаўся ў прамежку ад трэці да чвэрці памеру Венеры..

Чаму ж сучасныя касмічныя апараты да гэтага часу не заўважылі Антызямлю? На гэта прыхільнікі існавання Глорыі прыводзяць шэраг аргументаў. Па-першае, касмічныя станцыі не «глядзяць па баках». Для пастаяннага ўдакладнення і карэкцыі арбіты іх «электронныя вочы» скіраваныя на канкрэтныя касмічныя аб'екты, якія выкарыстоўваюцца для арыентавання. Па-другое, адлегласць ад Зямлі да Антызямлі настолькі вялікая, што ў бязмежнай засонечнай прасторы можа «схавацца» дастаткова буйное цела і доўгі час заставацца нябачным (тут трэба браць у разлік памеры самога Сонца і эфекты, якія яно стварае). Нябачны ўчастак прасторы за Сонцам (з улікам Сонечнай кароны) раўняецца дзесяці дыяметрам месяцавай арбіты, ці 600 дыяметрам Зямлі. Адсюль вынікае, што месца, куды можа схавацца загадкавая планета, больш чым дастаткова. Амерыканскія астранаўты, якія высадзіліся на Месяц, не маглі ўбачыць Глорыю — для гэтага ім неабходна было б адляцець у 10—15 разоў далей.

З гэтага вынікае, што з улікам адлегласці, памеру і свяцімасці Сонца не дзіўна, што Антызямля так і застаецца нявыяўленай.

Для таго, каб раз і назаўсёды пераканацца ў наяўнасці планеты за Сонцам, сцвярджаюць прыхільнікі яе існавання, варта зрабіць фотаздымкі адпаведнага ўчастка арбіты Зямлі. Касмічны тэлескоп «SOHO», што пастаянна фатаграфуе Сонца, знаходзіцца занадта блізка ад Зямлі і не можа «ўбачыць» Глорыю. Праясніць сітуацыю магла б серыя здымкаў са станцый на калямарсіянскай арбіце. Але ёсць версія, што Глорыю ад нас нехта старанна хавае (напрыклад, самі гларыянцы). Менавіта нябачным іншапланетным «дыверсантам» прыхільнікі тэорыі існавання Антызямлі прыпісваюць правал місій дзвюх савецкіх аўтаматычных станцый «Фобас-1» і «Фобас-2». Маўляў, іх знішчылі з-за таго, што яны «ўбачылі» нашу арбітальную суседку.

...Прыхільнікі існавання Глорыі лічаць, што яна і ёсць тая 12-я планета, якой неставала для стройнага і ўстойлівага малюнка будовы Сонечнай сістэмы і якая пацвярджаецца і старажытнымі тэкстамі. Напрыклад, шумеры сцвярджалі, што менавіта з 12-й планеты нашай Сонечнай сістэмы на Зямлю спусціліся «Багі Неба і Зямлі». Варта падкрэсліць, што знаходжанне планеты менавіта за Сонцам змяшчае яе ў вобласць, спрыяльную для жыцця. Ёсць падставы меркаваць, што крыніца ведаў старажытных цывілізацый мела іншапланетнае паходжанне.

— Існаванне Антызямлі нельга лічыць даказаным навуковым фактам, — сцвярджае **дырэктар Абсерваторыі БДУ кандыдат фізіка-матэматычных навук Ольгерд КУЗНЕЧЫК**. — У нас пакуль няма неабвержных навуковых доказаў. Як гіпотэза, яна мае права на існаванне, хоць верагоднасць наяўнасці на арбіце Зямлі яшчэ адной планеты вельмі маленькая. Чаму? Прынцып утварэння ўсіх часціц — ад пылінкі да зоркі — прыблізна аднолькавы. У воблаку пылу і газу, якое верціцца, узнікаюць цэнтры кандэнсацыі, што абумоўлівае перапады ціску ўнутры воблака і ўтварэнне своеасаблівых віхраў. Вакол такіх цэнтраў пачынаюць кандэнсавацца акаляючыя часціцы з наступным ушчыльненнем. Потым такія дробныя асобныя «целы», якія рухаюцца па агульнай арбіце, злучаюцца ў адно. Пры гэтым адбываецца «вымятанне» малых часціц і целаў з гэтай арбіты. З гэтай прычыны верагоднасць існавання дзвюх раўнацэнных планет на адной арбіце вельмі малая, хоць, паўтаруся, сама па сабе гіпотэза даволі цікавая.

— У гісторыі навукі ёсць прыклады аналагічных адкрыццяў, каб вакол нейкай зоркі на адной арбіце абарачалася дзве планеты?

— Такога не было. Ужо адкрыта 429 планет (у тым ліку і цэлых планетных сістэм) каля іншых зораў, але такой з'явы, калі на адной арбіце знаходзяцца дзве планеты, пакуль не выяўлена. Некаторыя планеты былі спачатку адкрыты «на кончыку пяра» (тэарэтычна) і толькі потым — на практыцы. Значыць, калі б такая сістэма дзвюх планет на адной арбіце існавала, яна б неяк праявіла сябе, уплывала на іншыя касмічныя аб'екты, гэта можна было б зафіксаваць і зрабіць адпаведныя высновы. Пакуль што на падставе існуючых тэорый узнікнення касмічных целаў (ад мікра да макра і супермакра) такіх высноў мы зрабіць не можам.

— А як жа меркаванне, што Антызямля можа мець штучнае паходжанне?

— Навуковых звестак, якія пацвярджалі б наяўнасць недзе ў космасе іншых цывілізацый, пакуль няма. Усе праграмы, якія былі скіраваны на пошук іншых цывілізацый, не далі ніякага выніку.

— Як вы ацэньваеце прыведзеныя вышэй аргументы прыхільнікаў тэорыі існавання Глорыі? Наколькі яны пераканаўчыя з пункту гледжання навукі?

— Пачнём з Філалая. Як сцвярджаюць энцыклапедыя Britanica, Вялікая Савецкая Энцыклапедыя і іншыя даведачныя крыніцы, якія заслугоўваюць даверу, Філалай Кратонскі (Грэцыя, 5 стагоддзе да новай эры) упершыню выказаў ідэю руху Зямлі вакол нейкага цэнтральнага агню. Менавіта гэта, на яго думку, было асноўнай прычынай змены дня і ночы. Ён вёў гаворку не аб дзвюх планетах на адной арбіце, а паказваў рух адной (нашай Зямлі) вакол нейкага «цэнтральнага агню».

Джавані Дамініка Касіні зрабіў шмат адкрыццяў. На яго рахунку, апроч іншых, 4 новыя спадарожнікі Сатурна (іх адкрыцці былі зроблены Касіні ў перыяд з 1671 па 1784 год). Канкрэтна ў 1672-м ім быў вынайдзены пяты спадарожнік Сатурна — Рэя. Калі б у яго надарылася такое адкрыццё, як планета за Сонцам, гэтую інфармацыю абавязкова зафіксавалі б.

Англійскі астраном і оптык Джэймс Шорт (гады жыцця 1710—1768) стварыў каля 1400 люстраных тэлескопаў высокай якасці, вынайшаў высокадакладны маятнікавы гадзіннік. І ўсё гэта было зафіксавана. Цалкам натуральна, што ён назіраў за небам, калі правяраў свае тэлескопы, але дакладных звестак пра гэта няма. Насамрэч, ён мог убачыць спадарожнік, скажам, Сатурна ці Юпітэра, астэроід ці нейкае іншае нябеснае цела.

Што датычыцца Барнарда, ён у 1892 годзе адкрыў пяты спадарожнік Юпітэра — Амальцею і некалькі камет (што сведчыць аб яго высокай кваліфікацыі). Таму, калі б у яго атрымалася ўбачыць нешта падобнае на планету за Сонцам, гэта абавязкова б прагучала.

— А што насамрэч здарылася з «Фобасамі»?

— Недасканала была спланавана навігацыя. І да гісторыі з «Фобасамі», і пасля яе для арыентацыі ўсіх беспілотных даследчых станцый у касмічнай прасторы прымянялася звычайная эўклідава геаметрыя. А для «Фобасаў» вырашылі прымяніць геаметрыю, заснаваную на тэорыі адноснасці. Неадпаведнасці паміж разлікамі вучоных і рэальнасцю прывялі да збою ў арыентацыі, і «Фобасы» проста сышлі з курсу.

Тэлескоп «SOHO» сочыць у першую чаргу за працэсамі, якія адбываюцца ў атмасферы Сонца. Акрамя таго, з дапамогай «SOHO» выяўляюць вельмі шмат камет, якія «шкрабаюць» нашу зорку, — праходзяць паблізу Сонца ці падаюць на яго (што выклікае на паверхні зоркі пэўныя змяненні і ўзрушэнні). Здараецца, пры апрацоўцы фотаздымкаў, атрыманых ад «SOHO», вучоныя вынаходзяць новыя каметы.

— Прыхільнікі тэорыі існавання Антызямлі лічаць яе 12-й планетай шумераў, адкуль сышлі багі...

— На сёння ў нашай Сонечнай сістэме засталося 8 планет. Плутон «разжалавалі» ў карлікавыя планеты пасля таго, як знайшлі ў поясе Копера вельмі шмат целаў, якія па памерах блізкія да Плутона. А далей магчымыя варыянты: альбо гэта нейкая планета з доўгай перыядычнасцю абарачэння вакол Сонца (3-4 тысячы гадоў), альбо камета з вельмі выцягнутай арбітай. У любым выпадку гэтае нябеснае цела не знаходзіцца на адной арбіце з Зямлёй. Што датычыцца 10-й і 11-й планет, магчыма, за іх старажытныя шумерскія астраномы прымалі асобныя спадарожнікі, той жа Месяц.

Ёсць меркаванне, што раней на блізкіх да Сонца арбітах — перад Меркурыем — былі іншыя планеты і, магчыма, цывілізацыя той планеты, якая займала тады трэцюю арбіту (дзе сёння знаходзіцца Зямля) прадбачыла катастрофу і перасялілася на больш аддаленую суседнюю Зямлю...

Аднак не трэба сучасную навуку лічыць ісцінай у апошняй інстанцыі. За апошнія 10—15 гадоў зроблена вельмі шмат адкрыццяў, якія не толькі мяняюць наша ўяўленне аб навакольным свеце, але і прымушаюць па-іншаму паглядзець на астраномію папярэдніх цывілізацый і народаў. Яны пацвярджаюць, што астранамічныя веды ў старажытнасці былі на больш высокім узроўні, чым было прынята лічыць, і заслугоўваюць павагі і дасканалага вывучэння. Узнік новы раздзел навукі — **археаастраномія**, якая спалучае археалогію і астраномію. Яна разглядае культавыя збудаванні старажытнасці, знойдзеныя археолагамі, і з пункту гледжання астраноміі. Многія такія пабудовы служылі не толькі культавым мэтам, але і для назірання за небам, што цалкам натуральна, бо старажытныя цывілізацыі таксама цікавіліся навакольным светам. У многіх народаў зоры і планеты атаясамліваліся з багамі. Людзі назіралі, як жывуць багі, каб высветліць, што яны ім рыхтуюць. У тых жа шумераў (3,5 тысячы гадоў да новай эры) сімвалам «цінгір» абазначалася і зорка, і нябеснае боства.

Узгадаю яшчэ апошнія археалагічныя экспедыцыі на поўнач Расіі 1998—2001 гадоў, даследаванні старажытнага горада арыяў Аркаіма. У Сібіры вынайдзена цэлая краіна старажытных гарадоў, дзе задоўга да егіпецкіх пірамід існавала высокаразвітая цывілізацыя. Там былі абсерваторыі, зарыентаваныя па чатырох баках свету з большай дакладнасцю, чым той жа Стоўнхэндж. Вельмі высокай была і дакладнасць вызначэння старажытнымі аркаімцамі руху планет і зорак.

Яшчэ некалькі стагоддзяў таму французскі астраном, акадэмік некалькіх акадэмій Баі ў сваіх лістах Вальтэру не толькі абгрунтаваў, але і даказаў, што на Поўначы, у Сібіры некалі існаваў народ, чые веды ў астраноміі былі вышэйшыя, чым у агульнапрызнаных цэнтрах астраноміі старажытнага свету. Вельмі верагодна, што Атлантыду і Гіпербарэю трэба шукаць менавіта там, недзе за Кольскім паўвостравам.

— З улікам таго, што апошнім часам веды старажытных цывілізацый знаходзяць пацвярджэнне сучаснай астраноміі, наколькі верагодна меркаванне, што ўсю гэтую інфармацыю людзі атрымалі калісьці «звонку», ад тых жа «багоў» у іх уяўленні? Ад іншых планет, зоркавых сістэм?

— Я не схільны так думаць. Па-першае, пераклад іерогліфаў, прачытанне старажытных манускрыптаў можа мець некалькі варыянтаў. Трактаваць іх можна па-рознаму. Па-другое, развіццё чалавецтва — не лінейнае. У яго гісторыі былі ўзлёты (росквіт пэўнай цывілізацыі), былі і падзенні (напрыклад, змрочныя часы Сярэднявечча). Старажытныя астраномы вялі назіранні, складалі сістэмы, календары. Яны былі вельмі назіральнымі і апісвалі з'явы, якія бачылі, зыходзячы са свайго ўзроўню разумення. Прывяду такі прыклад. Мы цяпер карыстаемся грыгарыянскім календаром, які прыйшоў на змену юліянскаму. Юліянскі каляндар першым увёў Юлій Цэзар, але такі ж самы каляндар выкарыстоўваўся ў Старажытным Егіпце ў 1800-х гадах да новай эры. Пасля заваявання Егіпта гіксосамі (людзьмі на конях) у XVIII стагоддзі да н.э. цар Саліціс паспрабаваў правесці каляндарную рэформу. Ён запатрабаваў дабаўляць кожныя чатыры гады па адным дадатковым дні, які выроўніваў ход часу. Аднак праз 100 гадоў, калі гіксосы былі выгнаныя, егіпцяне зноў пачалі вылічваць час па сваім традыцыйным календары, устаноўленым Тотам (уладаром часу). Калі Еўропа адмовілася ад юліянскага календара, яна перайшла на грыгарыянскі, як на больш дакладны. Але тады варта было ўзяць персідскі каляндар, унікальны па сваёй дакладнасці і прастаце. У яго аснову быў пакладзены распрацаваны вучоным і паэтам Амарам Хаямам 33-гадовы цыкл з 8 высакосамі. Гэты каляндар быў больш набліжаны да нераўнамернага гадавога руху Сонца па экліптыцы. У ім усе месяцы першай паловы года мелі па 31 дню, а месяцы другой паловы — па 30 дзён, акрамя апошняга, які ў просты год меў 29 дзён. Год пачынаўся з дня веснавога раўнадзенства. Яго працягласць складала 365,24242 сярэдніх сонечных сутак, інакш кажучы, усяго на 0,00022 сутак даўжэй за трапічны. Такім чынам, розніца ў адны суткі набягае за 4500 гадоў. Каляндар быў уведзены ў Персіі ў 1079 годзе і быў адменены ў Іране толькі ў 1976-м.

Калі ж разгледзець магчымасць прыўнясення нам ведаў «звонку», то тут магчымыя розныя варыянты. Напрыклад, нам вядома, што планеты, якія знаходзяцца на блізкіх ад зоркі арбітах, з часам падаюць на яе. Ёсць меркаванне, што раней на блізкіх да Сонца арбітах — перад Меркурыем — былі іншыя планеты і, магчыма, цывілізацыя той планеты, якая займала тады трэцюю арбіту (дзе сёння знаходзіцца Зямля) прадбачыла катастрофу і перасялілася на больш аддаленую суседнюю Зямлю...

Астраномія — адна з самых старажытных навук, якая тлумачыць светаўладкаванне, дае светаразуменне і з'яўляецца элементам культуры. У наступным археаастралогія, думаю, яшчэ здзівіць нас шматлікімі дзіўнымі адкрыццямі.

Гутарыла Інга МІНДАЛЁВА.

НДІ ЭВМ: на вастрыі прагрэсу

На прайшоўшым нядаўна Дні беларускай навукі добра вылучалася тэматыка работ, прапанаваная калектывам навукова-даследчага інстытута электронна-вылічальных машын (НДІ ЭВМ). Інстытут, які пры савецкім часе быў вядучым у Саюзе ў галіне стварэння сродкаў вылічальнай тэхнікі, па тэхнічнай дакументацыі якога працавалі дзясяткі заводаў на прасторах былой савецкай краіны, не страціў сваёй «кваліфікацыі» і цяпер. Больш за тое, пазбаўлены магчымасцяў ранейшага цэнтралізаванага і, як правіла, першачарговага фінансавання, пастаўлены ва ўмовы жорсткага выжывання, калі пераважную частку заказаў трэба знаходзіць самастойна, прычым многія распрацоўкі выконваць у так званым ініцыятыўным парадку, або на свой страх і рызыку, за ўласныя і вельмі абмежаваныя сродкі, без стапрацэнтнай гарантыі збыту гэтых вырабаў і адпаведна вяртання тых жа сродкаў, НДІ ЭВМ значна пашырыў поле сваёй дзейнасці, поле свайго навуковатворчага пошуку, дадаўшы да распрацовак па сваім асноўным профілі шэраг іншых электронных вырабаў і кампанентаў. Пры ўсім гэтым інстытут добра развіў сваю вытворчую базу, наладзіў доследную серыйную вытворчасць па выніках найбольш запатрабаваных доследна-канструктарскіх работ. Словам, у ім ужо не абмяжоўваюцца толькі прапанаваннем канструктарскіх ідэй і адпаведнай тэхнічнай дакументацыі, а тут жа, у сваіх вытворчых падраздзяленнях, увасабляюць гэтыя ідэі непасрэдна ў жыццё, у канкрэтныя электронныя вырабы.

Новы ноўтбук прадстаўляе начальнік аддзела Анжэла ШАЎЦОВА.

У 2008 годзе НДІ ЭВМ адзначыў 50-годдзе свайго існавання. На самым пачатку гэта былі няпростыя гады станаўлення ў былой савецкай краіне вытворчасці электронна-вылічальнай тэхнікі, станаўлення, у якое менавіта мінскі НДІ ЭВМ і зрабіў пераважны, найбольшы ўнёсак. У няпростых умовах калектыў НДІ працуе і сёння. Што дапамагае яму адносна паспяхова дзейнічаць і развівацца менавіта цяпер? Дырэктар НДІ ЭВМ Павел Сідорык адзначае:

— Нам удалося захаваць з савецкага часу працаздольнае ядро калектыву, неабходную інфраструктуру, захаваць ядро творчых спецыялістаў, прафесіяналаў, людзей, якія здольныя ствараць унікальныя электронныя рэчы, ствараць вырабы, што ніколькі не саступаюць узорам вядучых сусветных вытворцаў. Наша сфера дзейнасці адносіцца да высокатэхналагічных, высокаінтэлектуальных, калектыў НДІ ЭВМ у нашай краіне па сутнасці стаіць на вастрыі навукова-тэхнічнага прагрэсу. І ён гатовы выканаць любы, самы складаны заказ у галіне стварэння электроннай тэхнікі, і ў першую чаргу ў галіне стварэння электронных вылічальных сродкаў...

Так сказаў, нагадаем, дырэктар НДІ ЭВМ Павел Сідорык. Нам, па сутнасці, толькі застаецца пацвердзіць гэтыя словы адпаведнымі прыкладамі з дзейнасці інстытута. Што мы з задавальненнем і робім.

* * *

Ад найбольш простых ЭВМ «Мінск-1», у склад элементнай базы якіх уваходзілі ўжо забытыя цяпер электронныя лямпы, з хуткадзеяннем тры тысячы аперацый за секунду, да складаных вылічальных комплексаў ЭВМ ЕС (у апошняй мадэлі ЭВМ ЕС1230 хуткадзеянне складала да 280 мільёнаў аперацый за секунду, а ў суперкамп'ютарах інстытута — трыльёны аперацый), прайшоў свой шлях НДІ ЭВМ (на самым пачатку гэта было СКБ Мінскага завода лічыльных машын імя Арджанікідзэ). Што цяпер уваходзіць у спектр сродкаў яго электронна-вылічальнай тэхнікі? Гэты спектр даволі шырокі: гэта ў першую чаргу персанальныя ЭВМ, а таксама машыны класа «ноўтбук», гэта таксама суперкамп'ютарныя вылічальныя сістэмы.

Пра створаныя калектывам НДІ ЭВМ (ці дакладней — створаныя з яго пераважным удзелам) суперкамп'ютары «СКІФ К-1000» і «Скіф К-500» расказвалася ўжо раней, і тым не меней нагадаем пра гэтыя распрацоўкі яшчэ раз. Аглушальным поспехам быў названы вынік апошняй з гэтых распрацовак: згодна з сусветным рэйтынгам, суперкамп'ютар «Скіф К-1000» увайшоў у лік «top-500», або ў лік 500 найлепшых сусветных суперкамп'ютараў (98-е месца). Пра гэта сведчыць і адпаведны міжнародны сертыфікат.

Як развіваюць адзначаную тэматыку ў інстытуце цяпер?

— Мы працягваем распрацоўваць і збіраць суперкамп'ютары, — расказаў першы намеснік дырэктара інстытута Дзмітрый Жаваранкаў. — Але гэта прынцыпова ўжо зусім іншыя электронна-вылічальныя комплексы. Тэхніка, навукова-тэхнічны прагрэс, у параўнанні з 2004 годам, у якім і вызначыўся класцер (суперкамп'ютар) К-1000, зрабілі вялікі крок наперад. Зрабілі гэты крок і мы. Параўнаем: той жа «К-1000» каштаваў прыкладна каля 5 мільярдаў рублёў. А вось класцер, які мы цяпер вырабляем, мае тую ж прадукцыйнасць, што і «К-1000», але ён пры гэтым у 5 разоў меншы па аб'ёмах і з меншым у 2,5 раза энергаспажываннем. І будзе каштаваць ужо не 5 мільярдаў, а ўсяго 30—40 мільёнаў рублёў. Думаю, што наша новая распрацоўка ВМ 5100.45 зможа прэтэндаваць на адно з першых месцаў у спісе «top-50» лепшых суперкамп'ютараў СНД (адпаведны спіс абнаўляецца два разы на год, чарговы конкурс — праз месяц, у сакавіку). Нашы сістэмы можна выкарыстоўваць, напрыклад, для прагнозу надвор'я. Скажам, тая работа, на якую ў Гідраметэацэнтры затрачвалі не меней за суткі, з выкарыстаннем суперкамп'ютараў можа выконвацца за 20—30 хвілін. Вялікія магчымасці надаюць яны сістэмам аўтаматычнага праектавання, мадэлявання пэўных сітуацый.

— Мы цяпер пачалі вырабляць класцеры, — працягваў Дзмітрый Жаваранкаў, — так бы мовіць, набліжаныя да чалавека, якія знаходзіліся б не ў цэнтрах калектыўнага карыстання, як нашы першыя суперкамп'ютары, а ў асобных калектывах, арганізацыях. У нас нават з'явілася такое паняцце — «персанальны класцер»...

Дзмітрыя Жаваранкава дапоўніў Аляксандр Рымарчук, намеснік галоўнага канструктара па суперкамп'ютарных сістэмах:

— Персанальныя класцеры аказаліся добра запатрабаваныя, і мы ўжо паставілі іх на БелАЗ, у Наваполацкі ўніверсітэт і іншыя арганізацыі, персанальны класцер хутка будзе задзейнічаны ў Інстытуце цепламасаабмену. Такія класцеры, як правіла, прызначаны для рашэння адносна невялікіх задач. Яны з'яўляюцца гэткім прамежкавым звяном паміж персанальнымі камп'ютарамі і суперкамп'ютарамі.

Разам з тым, падкрэсліваў Аляксандр Рымарчук, для рашэння больш маштабных задач можна і трэба аб'ядноўваць вылічальныя рэсурсы асобна ўзятых арганізацый у адзіныя, або так званыя паралельныя сістэмы.

Ён таксама падкрэсліваў: суперкамп'ютарныя сістэмы, якія распрацоўваюцца ў інстытуце, патрэбны нам не дзеля прэстыжу, як часам мяркуюць, і асабліва — калі спасылаюцца на поспех «К-500» і «К-1000», а менавіта дзеля справы, дзеля найлепшага вырашэння праблем і задач інфарматызацыі краіны, якім цяпер надаецца вялікая ўвага.

Для таго, каб камп'ютарная тэхніка, вылічальныя комплексы, якія ствараюцца ў інстытуце, найлепшым чынам адпавядалі цяперашнім высокім патрабаванням, у ім выкарыстоўваюць найноўшую элементную базу, прычым у шмат якіх выпадках — імпартную, набытую ў лепшых сусветных вытворцаў, сучасныя высокапрадукцыйныя працэсары, закладваюць прагрэсіўныя тэхналогіі эксплуатацыі гэтай тэхнікі (у прыватнасці, Аляксандр Рымарчук у якасці прыкладу прыводзіў удалую распрацоўку, зробленую сумесна з Інстытутам парашковай металургіі, у выніку прымянення якой у вылічальных комплексах сталі нашмат лепей ахаладжвацца іх найбольш «гарачыя» кампаненты).

Ужо на працягу многіх гадоў спецыялісты ўпраўлення Аляксея ЖАЎРЫДА (на здымку) займаюцца аўтаматыкай сістэмы аплаты праезду ў Мінскім метрапалітэне.

НДІ ЭВМ добра вядомы як вытворца сродкаў электронна-вылічальнай тэхнікі, закліканай працаваць у так званых нестандартных умовах, або ва ўмовах высокай вільготнасці, салёнага марскога туману, празмернай гарачыні, холаду, моцнай вібрацыі і г.д., а таксама тэхнікі, якая мае высокую ступень абароненасці інфармацыі ад несанкцыяванага доступу да яе, ад уцечкі гэтай інфармацыі за кошт пабочных электрамагнітных выпраменьванняў, перахоплівання яе за кошт знешніх навядзенняў. У інстытуце для адпаведных мэтаў створаны цэнтр камп'ютарнай бяспекі і сертыфікацыі, у ім дзейнічае спецыяльная лабараторыя, у якой тэхніка правяраецца менавіта на яе абароненасць ад знешніх уздзеянняў, на магчымасць несанкцыянаванага доступу да яе базаў звестак. Надзейнасць тэхнікі НДІ ЭВМ, падкрэсліваюць тут, як у чыста эксплуатацыйным плане, так і ў плане закрытасці інфармацыі, якую яна апрацоўвае, — гарантаваныя.

* * *

Менавіта з адной з такіх апошніх распрацовак пазнаёмілі нас ва ўпраўленні, якім кіруе Яўген Астрамухаў. Гэта ноўтбук, які можа працаваць у любых, нават самых жорсткіх умовах (крытычныя плюсавы і мінусавы тэмпературныя рэжымы — да плюс 60 і да мінус 40, дождж, пыл, механічныя ўздзеянні і г.д.). Ён пры ўсім гэтым мае высокую абароненасць ад несанкцыяванага доступу да яго інфармацыі. Як расказалі ва ўпраўленні, падобныя рэчы тут выраблялі і раней. Але гэта было «зусім не тое». Цяперашняя распрацоўка поўнасцю выкананa ў самім упраўленні, у ноўтбуку стаіць створаная яго ж спецыялістамі ўласная мацярынская плата, у якую і інтэграваная тая ж сістэма абароны ад несанкцыяванага доступу; імпартны ў ноўтбука — толькі мікрапрацэсар. Паколькі плата свая, падкрэслівалі ва ўпраўленні, у ноўтбук можна закласці, пры жаданні заказчыка, шэраг дадатковых функцый, напрыклад — арыентацыю на мясцовасці. А галоўнае, як таксама падкрэслівалі тут, у поўнасцю сваім, сабраным са сваёй камплектацыі ноўтбуку выключаецца магчымасць розных так званых закладак, або, прасцей кажучы, звычайных жучкоў, з дапамогай якіх пастаўшчык гэтай камплектацыі мог бы здымаць з яго інфармацыю. Ноўтбук, падкрэслівалі таксама ва ўпраўленні, дзякуючы таму, што ў ім стаіць свая мацярынская плата, у якую, калі гэта спатрэбіцца, у любы час можна ўнесці пэўныя змены, можа стаць доўгажыхаром на рынку сярод роднасных яму машын. Аналагічных яму — з такімі ж магчымасцямі выкарыстання і такой жа надзейнасцю, такіх жа зручных, кампактных, а пры ўсім гэтым прымальных па цане, сёння на тым жа рынку няма. У сакавіку ноўтбук чакаюць дзяржаўныя выпрабаванні — у іх паспяховасці ва ўпраўленні Яўгена Астрамухава не сумняваюцца. Сфера прымянення гэтага ноўтбука, якую яму прызначылі, — дзяржаўныя структуры. Дарэчы, кіраўніку ўпраўлення было зададзена такое пытанне, якое яўна напрошвалася: «А ноўтбук «для народа» яго спецыялісты змаглі б зрабіць? «Без праблем, калі такая задача будзе пастаўлена. І гэта нават прасцей зрабіць, чым тое, што мы маем цяпер».

* * *

Можна меркаваць, нават не ўсе спецыялісты сталічнага пасажырскага транспарту (як падземнага, так і наземнага) так добра ведаюць усе яго праблемы, як іх ведае Аляксей Жаўрыд, кандыдат тэхнічных навук, член-карэспандэнт Міжнароднай акадэміі інфарматызацыі, начальнік аднаго з упраўленняў НДІ ЭВМ. Менавіта з удзелам спецыялістаў гэтага ўпраўлення і непасрэдна самога Аляксея Жаўрыда поўнасцю аўтаматызаваная сістэма аплаты праезду ў Мінскім метрапалітэне. Прычым гэта сістэма прайшла пяць мадэрнізацый (у тым ліку шлях ад жэтона да магнітнай карткі і да больш сучаснай электроннай бескантактнай карткі); разам з аўтаматызацыяй праезду ў метрапалітэне з яе дапамогай наладжаны збор звестак па пасажырапатоках (па ўсіх станцыях асобна), маніторынг стану тэхнічнага абсталявання і відэаназіранне і г.д. Сістэма аўтаматызацыі аплаты праезду пасажыраў у метро прызнана адной з лепшых у СНД; творчы калектыў НДІ ЭВМ за адпаведны ўнёсак у гэту справу двойчы станавіўся лаўрэатам рэспубліканскіх прэмій — Міністэрства прамысловасці краіны і Ваенна-прамысловага камітэта... Якая работа вядзецца ў адпаведных кірунках цяпер?

Варта чакаць, што з цягам часу мы станем зусім па-іншаму плаціць за праезд, і ў першую чаргу ў метро — з улікам так званага зоннага прынцыпу, як, дарэчы, плацяць у шмат якіх еўрапейскіх краінах. Гэта значыць, што той жа праязны білет будзе дзейны не на пэўны час, як цяпер, без уліку таго факта, колькі зроблена па ім паездак і якой працягласці, а менавіта з улікам працягласці гэтых паездак: адпаведная аўтаматыка палічыць, колькі вы праехалі, і спіша ў вашым білеце адпаведную колькасць пэўных выкарыстаных адзінак у якасці аплаты. Такая аўтаматыка ўжо распрацавана ва ўпраўленні, якім кіруе Аляксей Жаўрыд, і ўжо стаіць на некалькіх станцыях метрапалітэна, у тым ліку, напрыклад, на станцыі Якуба Коласа (на выхадных турнікетах). «Каб укараніць у тым жа метро прынцып зоннага праезду, — зазначае Аляксей Жаўрыд, — трэба ўсталяваць такія турнікеты, якія і павінны спісваць пэўныя разліковыя адзінкі з праязных білетаў, на ўсіх станцыях».

Да распрацовак па аўтаматызацыі аплаты праезду, якія вядуцца ва ўпраўленні Аляксея Жаўрыда, выказана таксама цікавасць і з боку арганізацый, што адказваюць за наземны гарадскі пасажырскі транспарт. У прыватнасці яны заказалі ўпраўленню Аляксея Жаўрыда распрацаваць канцэпцыю сістэмы кантролю па аплаце праезду з выкарыстаннем ужо знаёмай для нас бескантактнай карткі ў наземным гарадскім пасажырскім транспарце. І такая канцэпцыя ўжо распрацавана і зацверджана Мінгарвыканкамам. Праглядваецца і перспектыва ўкаранення ў наземным пасажырскім транспарце таго ж ужо названага прынцыпу зоннага праезду.

Як зазначыў Аляксей Жаўрыд, па ўсіх гэтых пытаннях паўстае шэраг праблем. Галоўная ж з іх — адсутнасць належнага фінансавання па арганізацыі адпаведных распрацовак і іх укараненні. Усе гэтыя пытанні чакаюць свайго вырашэння. І адпаведныя выдаткі — поўнасцю апраўданыя. Паводле падлікаў, толькі метро, у якім кошт сваіх цяперашніх паездак пасажыры аплачваюць толькі напалову (другую палову складаюць дзяржаўныя датацыі; дарэчы, акупнасць наземнага гарадскога пасажырскага транспарту — яшчэ меншая), прыносіць за год у гарадскі бюджэт каля 200 мільярдаў рублёў.

* * *

— Народнагаспадарчыя праекты займаюць важнае месца ў нашай дзейнасці, — казаў Дзмітрый Жаваранкаў. — Прычым знаходзім гэтыя праекты не толькі мы самі. Нас шмат хто ведае, да нас звяртаюцца з адпаведнымі прапановамі. Летась да нас звярнулася адна з брэсцкіх фірмаў, якая вырабляе малочныя танкі для ахаладжвання і захоўвання малака ў гаспадарках перад адпраўкай яго на завод. Ёй спатрэбілася электронная кампанента, якая рэгулявала б адпаведныя тэмпературныя рэжымы ў гэтых танках і іншыя моманты, такую апаратуру фірма купляла за мяжой — у Бельгіі і Галандыі. Нашы спецыялісты стварылі адпаведны праграмна-апаратны комплекс (ён атрымаў назву «Снег»), які нядаўна прайшоў выпрабаванні, пратакол гэтых выпрабаванняў — станоўчы. Гэту распрацоўку, якую можна запісаць на рахунак імпартазамяшчэння, мы выканалі за свае грошы, прычым выдаткавалі даволі значную суму. Але ў цэлым атрымалі добры заказ. Мы павінны вырабіць на працягу года 200 такіх комплексаў, прычым — запатрабаванасць у такіх комплексах складае да тысячы за год.

Намеснік начальніка ўпраўлення, у якім распрацоўваўся гэты комплекс, Віталь Ігнаценка, ахарактарызаваў яго вартасці, пры гэтым зазначыў, што створаны тут комплекс можна выкарыстоўваць і ў іншых кірунках народнай гаспадаркі. Паводле слоў Віталя Ігнаценкі, гэты комплекс можа рэгуляваць не толькі тэмпературу, але і напружанне ў электрасетцы, частату гэтай сеткі, адключаць усе нагрузкі пры нейкіх непаладках і г.д. У ім можна ўстанавіць GSM-мадэм, а значыць можна па мабільным тэлефоне атрымліваць звесткі з гэтага комплексу і даваць яму пэўныя каманды, дыстанцыйна дыягнаставаць яго... Словам, універсальнасць гэтага праграмна-апаратнага комплексу — відавочная.

* * *

— А вы хацелі б, будучы ў якасці авіяпасажыра або пасажыра турыстычнага аўтобуса, мець сваё індывідуальнае, прама перад сабой, відэа з шырокім наборам у ім розных фільмаў, гульняў і г.д.? — запытаўся ў нас падчас гутаркі ўжо знаёмы нам начальнік упраўлення Яўген Астрамухаў. — Думаю, што ўжо вельмі хутка мы зможам пазнаёміць вас з адпаведнай распрацоўкай...

Інтэрактыўная забаўляльная сістэма — так называецца гэта распрацоўка, якая выконваецца ў НДІ ЭВМ па заказе расійскай кампаніі. У перспектыве тут і кішэнна-далонны камп'ютар-бранзалет з убудаванымі ў яго сродкамі арыентацыі на мясцовасці, з сувязю і г.д. У цэлым у калектыву НДІ ёсць добры багаж задумак, разлічаных менавіта на перспектыву. А ёсць перспектыўныя задумкі, ёсць перспектыўныя напрацоўкі — значыць, ёсць і перспектыва далейшага развіцця.

* * *

Праўда, пры ўсім гэтым нельга не сказаць тут і пра іншае. НДІ ЭВМ, як ужо зазначалася вышэй, у самым пачатку нашага матэрыялу, па сутнасці, стаіць у нашай краіне на вастрыі навукова-тэхнічнага прагрэсу, яго дзейнасць адносіцца да высокатэхналагічных, высокаінтэлектуальных відаў дзейнасці. І гэта трэба ўлічваць у поўнай меры. Навукоўцы (а дзейнасць НДІ ЭВМ павінна ў першую чаргу разглядацца менавіта як навуковая) ужо даўно гавораць пра неабходнасць удасканалення сістэмы фінансавання навукова-даследчай і інавацыйнай дзейнасці. Але пры гэтым на практыцы яны па-ранейшаму больш заклапочаны не тым, каб рухаць прагрэс, а тым, каб выжыць. Той жа НДІ ЭВМ у сувязі з неабходнасцю самафінансавання значна больш займаецца і вытворчасцю распрацаванай прадукцыі. Адпаведныя магчымасці калектыву па стварэнні сучаснай электроннай тэхнікі, стварэнні канкурэнтаздольных сродкаў інфарматыкі стрымліваюцца і тым фактарам, што некаторы час таму ён з уласніка сваіх памяшканняў пераўтварыўся ў іх арандатара. А гэта, паводле слоў аднаго з намеснікаў дырэктара інстытута, кладзецца нялёгкім цяжарам на яго фінансы, а значыць аддаляе і тыя ж добрыя, унікальныя распрацоўкі.

Іван БАРАНОЎСКІ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

УНП 100219724.

Праграмаваннем і настройкай прыбораў «Снег» заняты інжынер-праграміст Павел БОНДАР.

Бернд ШТАНГЕ:

«НАША МЭТА — ВЫХАД У ФІНАЛ ЕЎРА-2012»

Учора Асацыяцыя «Беларуская федэрацыя футбола» правяла пасяджэнне выканкама, дзе быў зацверджаны каляндар матчаў чэмпіянату Беларусі па футболе на 2010 год, а таксама яго рэгламент. Футбольны сезон-2010 распачнецца 8 сакавіка матчам Суперкубка Беларусі і працягнецца да 20 лістапада. Матчы чэмпіянату краіны пройдуць з 3 красавіка па 20 лістапада. Нагадаем, што сёлета ў ім возьмуць удзел 12 камандаў, спаборніцтвы пройдуць у тры кругі. Як адзначыў старшыня федэрацыі футбола Генадзь Нявыглас, менавіта такі каляндар з'яўляецца найбольш выверанымі і ўлічвае пажаданні кіраўнікоў клубаў. З гэтага сезона павялічацца памеры заявачных узносаў для клубаў вышэйшай лігі. Яны складуць 110 мільёнаў рублёў (каля 27,5 тысячы еўра).

Галоўны трэнер нацыянальнай каманды Бернд Штанге расказаў членам выканкама пра падрыхтоўку зборнай да кваліфікацыі Еўра-2012. У прыватнасці, нямецкі спецыяліст паведаміў, што распрацаваны два планы падрыхтоўкі — працоўны і пашыраны, якія канчаткова будуць аформленыя пасля жараб'ёўкі (яна мае адбыцца 7 лютага). Галоўнай мэтай кваліфікацыі Штанге назваў выхад у фінальную частку турніру, задача-мінімум для нацыянальнай зборнай — заняць другое месца ў групе. «Незалежна ад выніку жараб'ёўкі, ад таго, хто дастанецца нам у суперніку з першага кошыка, — Іспанія, Германія, Галандыя ці Італія, лічу, што пасля апошніх двух гадоў наша каманда гатовая паспяхова прайсці кваліфікацыю і павінна гэта зрабіць», — заявіў галоўны трэнер. Ён паведаміў, што цяпер трэнерскі штаб зборнай арыентаваны на айчынных спецыялістаў, там пашырыцца колькасць медыцынскіх спецыялістаў і з'явяцца трэнеры-аналітыкі. Ролю апошніх будуць выконваць Вадзім Скрыпчанка, Аляксей Вергяенка і Юрый Шуканаў, у іх абавязкі ўваходзіць пошук кандыдатаў у моладзевую і нацыянальную каманды. Генадзь Нявыглас дадаў, што пакуль не вызначана, хто будзе дапамагаць Штанге ў трэнерскім працэсе з айчынных спецыялістаў. Меркавалася, што такія функцыі на сябе возьмуць галоўны трэнер БАТЭ Віктар Ганчарэнка і галоўны трэнер расійскага клуба «Сібір» Ігар Крывушэнка, аднак перамовы з абодвума кандыдатамі пакуль не далі станоўчых вынікаў.

Бернд Штанге падкрэсліў, што ў наступным адборачным цыкле сфармуляваны новыя маркетынгавыя задачы, і работа з балельшчыкамі і СМІ стане яшчэ больш актыўнай, акрамя таго, часткай плана значыцца паляпшэнне тэхнічных умоў беларускага футбола.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

СЁННЯ

Месяц
Апошняя квадра 6 лютага.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.49	16.58	9.09
Віцебск —	7.43	16.44	9.01
Магілёў —	7.40	16.48	9.08
Гомель —	7.31	16.50	9.19
Гродна —	8.08	17.10	9.02
Брэст —	8.04	17.14	9.10

Імяніны
Пр. *Еўдакіі, Кацярыны, Генадзя.*
К. *Агаты, Адэлаіды, Ізыдара.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дзве даты

5 лютага

1470 год — нарадзіўся Мікола Гусоўскі, беларускі паэт-гуманіст і асветнік эпохі Адраджэння. Прадстаўнік новалацінскай усходне-еўрапейскай літаратурнай школы. У 1518 годзе наведаў Рым у складзе дыпламатычнай місіі ВКЛ. У 1522-м па просьбе папы рымскага Льва X напісаў свой лепшы твор — «Песню пра сілу, дзікасць зубра і паляванне на яго». У кастрычніку 1523 года выдаў у Кракаве зборнік «Песню пра зубра», які складаўся з прразаічнага прысвячэння каралеве Боне Сфорца (прасіў яе ўзяць пад дзяржаўнае заступніцтва таленавітых людзей мастацтва), аднайменнай паэмы і 11 вершаў. Мікола Гусоўскі — заснавальнік жанру ліра-эпічнай паэмы ў літаратуры Усходняй Еўропы, стваральнік рэнесанснага мастацкага стылю ў літаратуры Беларусі. Памёр пасля 1533 г.



1494 год — упершыню ўстаноўлены дыпламатычныя адносіны паміж Маскоўскай дзяржавай і Вялікім Княствам Літоўскім.

Цытата дня:

«Іронія павінна быць кароткай. Шчырасць можа дазволіць сабе шматслоўе».

Жуль Рэнар (1854—1910), французскі пісьменнік.

Усміхнемся!

Як высветлілася, палюбоўніцу ў тэлефоне трэба запісваць пад імем «Нумар не вызначаны».

☺

— Афіцыянт, дайце цукарніцу для цукру, хлебніцу для хлеба, соўснік для соусу, і што-небудзь пад фейхоа...

☺

Добрыя дзяўчаты апранаюцца акуратна, дрэнныя — задзірліва, разумныя — хутка.

☺

— Я ў вас камп'ютар купіў. Дык ён здох.
— Гарантыя якая?
— Пажыццёвая.
— Раз здох — гарантыя скончылася.

☺

Часопіс «Cosmopolitan». Рубрыка «Карысныя парады»: Што рабіць, калі захварэў ваш любімы трус? Рэкамендацыі ветэрынара і кухара.

☺

Людаед змрочна паглядзеў на іх і сказаў:
— На першае-другое разлічыся!

Часопіс «Cosmopolitan». Рубрыка «Карысныя пара-

ІНЖЫНЕР-БРАКАНЬЕР

У лясным масіве КУП «Паляўніча-рыбалоўная гаспадарка «Лунінец» інспектары затрымалі інжынера ЖКГ г. Мікашэвічы, які пайшоў на дзіка, але ўбачыў казулю і незаконна застрэліў яе.

Стаіць пытанне аб крымінальнай справе.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

УЗЯЛІСЯ ЗА БАБРОЎ

На беразе Прыпяці супрацоўнікамі Столінскай міжрайінспекцыі выяўлена разбураная бабровая хатка і тры тушкі баброў, з якіх знялі шкуркі. Вышукам браканьераў займаецца міліцыя.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Любы татачка **Леанід Леанідавіч ГЕРЦЫК**, віншую **з 50-годдзем**!
Верно, Бог на свете есть.
Он принес благую весть.
Славно прожил — 50,
Продолжай и дальше так. **Дачка Маша,** *г. Мінск.*

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 573. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12